СОНЦА:
Усход, захад, даўжыня дня:
Мінск — 4.38, 21.45, 17.07;
Віцебск — 4,19, 21.44, 17.25;
Магілёў — 4.27, 21.34, 17.07;
Гомель — 4.34, 21.22, 16.48;
Гродна — 4.45, 21.59, 17.04;
Брэст — 5.05, 21.50, 16.45.
МЕСЯЦ:
Апошняя квадра 23 чэрвеня.
ІМЯНІНЫ:
Анупрэя, Пятра, Ганны, Арсеня, Сцапана, Андрэя; Люцыі, Вільгельма

ЗВЯЗДА

● выдаецца са жніўня 1917 г. ● БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА ● цана 1 рубель

25 ЧЭРВЕНЯ 1992 г.
чацвер, № 126 (21904)

ВОЗГАЛАС

ПРЫЁМ ПАСЛА ФРАНЦЫІ

24 чэрвеня Старшыня Савета Міністраў Беларусі В. Ф. Кебіч прыняў пасла Францыі Клода Жаліфа па яго просьбе. У час сустрэчы абмяркоўваліся пытанні далейшага развіцця двухбаковых беларуска-французскіх адносін і эканамічнага супрацоўніцтва.

СЛУЖБА ІНФАРМАЦЫІ САВЕТА МІНІСТРАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ—БЕЛТА.

ІНФАРМУЕ ЎПРАЎЛЕННЕ ІНФАРМАЦЫІ

Для паляпшэння інфармацыйнай работы, арганізацыі ўзаемадзеяння з дзяржаўнымі і замежнымі сродкамі масавай інфармацыі, з мэтай тлумачэння дзяржаўнай палітыкі ў галіне абароны і бяспекі краіны, задач абароннага будаўніцтва, ваеннай дактрыны, асвятлення актуальных праблем жыцця і дзейнасці Узброеных сіл Рэспублікі Беларусь у структуры Міністэрства абароны РБ створана ўпраўленне па сувязях і інфармацыі. **Кантактныя тэлефоны ў горадзе Мінску: 39-21-29, 27-35-64.**

БЯСПЛАТНЫ СЫР БЫВАЕ ТОЛЬКІ Ў ПАСТЦЫ

Выступаючы ў маі 1990 года ва універсітэце штата Паўднёвая Караліна, прэзідэнт Буш аб'явіў аб стварэнні Грамадзянскага Корпуса Дэмакратыі (ГКД): «Мы ведаем, што рэальная сіла нашай дэмакратыі ў яе грамадзянах, гэта калектыўная сіла асобных амерыканцаў. Мы збіраемся сканцэнтраваць гэту сілу там, дзе яна зможа прынесці максімальную карысць».

Днямі на чале з Паслом корпуса Солам Паланскім дэлегацыя ГКД прыбыла ў Мінск для пошуку напрамкаў далейшага ажыццяўлення сваёй праграмы па мабілізацыі ведаў і рэсурсаў прыватнага сектара ЗША для садзейнічання народам Цэнтральнай, Усходняй Еўропы і СНД у стварэнні дэмакратычных інстытутаў і свабоднай рынкавай эканомікі.

У канферэнц-зале акцыянернага таварыства «Мілавіца» адбылася сустрэча групы прадстаўнікоў ГКД з членамі беларускага Саюза прадпрымальнікаў і арандатараў, узначальваемых Максам Куняўскім. Як было адзначана амерыканскім бокам, і ў рэгіёне Беларусі ГКД плануе скіраваць намаганні на задавальненне канкрэтных патрэб рэспублікі, стаць цэнтрам абмену інфармацыяй аб праграмах бязвыплатнай дапамогі з ЗША.

РІД.

АСТАП БЕНДЭР, АУ!

Як паведаміла газета «Коммерсант Беларусь», у нашай рэспубліцы ствараецца Клуб мільянераў. Назва, магчыма, будзе іншай, але сутнасць захаваецца: членамі клуба будуць людзі, за якімі «стаіць» не менш чым 10 мільёнаў рублёў. На думку газеты, патэнцыяльных членаў такога клуба ў Беларусі «набярэцца» не менш за дваццаць чалавек. У саставу клуба, магчыма, увойдзе і прэзідэнт Саюза прадпрымальнікаў РБ Уладзімір Карагін.

«СЕМ Я», А ПРАБЛЕМ ЗНАЧНА БОЛЬШ

ГРОДНА. 70 гарадскіх сем'яў знайшлі аднадумцаў — яны стварылі аб'яднанне мнагадзетных сем'яў «Сем Я». Усяго ж у абласным цэнтры колькасць ячэек грамадства з пяццю і большай колькасцю дзяцей ужо пераваліла за сотню. Праблем у такіх сем'яў хоць адбаўляй, таму і вымушаны яны вырашаць іх разам. Нездарма кажуць: «Выратаванне тапельцаў — справа рук саміх тапельцаў».

У ПРЭЗІДЫУМЕ САВЕТА МІНІСТРАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

ПРЫВАТЫЗУЕМ ЖЫЛЛЁ

Пад старшынствам В. Ф. Кебіча ў Доме ўрада адбылося чарговае пасяджэнне Прэзідыума Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь. Цэнтральным у парадку дня быў праект пастановы ўрада «Аб зацвярджэнні Палажэння аб прыватызацыі жылых памяшканняў у дамах дзяржаўнага і грамадскага жыллёвага фонду, іх абслугоўванні і рамонце». З дакладам па гэтаму пытанню выступіў міністр жыллёва-камунальнай гаспадаркі Б. В. Батура.

Прэзідыум Савета Міністраў заслухаў інфармацыю аб ходзе выканання плана дадатковых мер па барацьбе са злачыннасцю, з якой выступіў міністр унутраных спраў У. Д. Ягораў. Занепакоены далейшым ростам злачыннасці, беларускі ўрад, зацвердзіўшы ў маі гэты план, узяў яго выкананне пад свой асаблівы кантроль. Па прапанове прэм'ер-міністра вырашана штомесячна заслухоўваць на пасяджэннях Прэзідыума справаздачы кіраўнікоў праваахоўных органаў, іншых кампетэнтных арганізацый, задзейнічаных на вырашэнне праблемы.

Факты і лічбы, якія прагучалі ў выступленні У. Д. Ягорава, не маглі не выклікаць трывогі. Хоць па тэмпах росту злачыннасці, па цяжкасці ўчыняемых злачынстваў, па іх раскрыццю становішча ў Беларусі адносна здавальняючае на фоне іншых рэспублік былога Саюза, тым не менш сітуацыя вельмі далёкая ад нармальнай. Працягваецца рост колькасці злачынстваў карыслівай накіраванасці, назіраецца павелічэнне колькасці асабліва цяжкіх злачынстваў, такіх, як забойствы, згвалтаванні, грабяжы. І зноў у гэтай сувязі

(Заканчэнне на 3-й стр.).

ВІЗІТ СТАРШЫНІ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ У ПОЛЬШЧУ

ПА КАМЕРТОНУ ЎЗАЕМНАЙ КАРЫСЦІ

Раніцай 23 чэрвеня лідэрамі Беларусі і Польшчы падпісаны першы ў летапісе двух народаў Дагавор аб добрасуседстве і супрацоўніцтве — дакумент вялікага палітычнага, эканамічнага і гуманітарнага гучання, дзеянне якога разлічана на пятнаццаць гадоў. Падпісаўшы яго, бакі згадзіліся будаваць свае адносіны на прынцыпах узаемнай павагі, добрасуседства і партнёрства, пацвердзілі існуючыя паміж імі граніцы, абавязаліся садзейнічаць працэсу раззбраення, адмовіліся ад прымянення сілы або пагрозы яе прымянення. Беларусь і Польшча дамовіліся праводзіць кансультацыі па пытаннях міжнароднай бяспекі, а таксама абароны. Яны будуць развіваць рэгулярныя кантакты паміж органамі дзяржаўнай улады і кіравання, прадугледзелі сустрэчы і кансультацыі на вышэйшым узроўні, а таксама міністраў замежных спраў. Дзяржавы дамовіліся садзейнічаць пашырэнню кантактаў паміж іх грамадзянамі, палітычнымі партыямі, прафсаюзамі, іншымі грамадскімі арганізацыямі і сродкамі масавай інфармацыі. У дагаворы замацавана абавязацельства захоўваць міжнародныя прынцыпы і стандарты, якія датычаць абароны правоў нацыянальных меншасцей. Будзе павялічана колькасць пагранічных пераходаў, праведзена іх мадэрнізацыя ў адпаведнасці з міжнароднымі нормамі і г. д.

У рэзідэнцыі, дзе размясцілася афіцыяльная дэлегацыя Беларусі, Старшыня Вярхоўнага Савета рэспублікі Станіслаў Шушкевіч прыняў прэм'ер-міністра Польшчы Вальдэмара Паўляка, міністра замежных спраў Кшыштафа Скубішэўскага, міністра знешняга гандлю Адама Гляпіньскага.

Адбыліся таксама зацікаўленыя дыялогі Станіслава Станіслававіча, членаў беларускай дэлегацыі з маршалам сейма Веславам Хшаноўскім, маршалам сената Аўгустам Хелкоўскім, з парламенцкай групай па сувязях з Рэспублікай Беларусь, закраналася шырокае кола пытанняў, таму што Польшча не толькі сусед, але і буйнейшы гандлёвы партнёр Беларусі. У мінулым годзе на яе прыпадала каля 18 працэнтаў нашага экспарту і 31 працэнт імпарту. З удзелам польскіх фірм у рэспубліцы створана амаль палавіна з усіх зарэгістраваных сумесных прадпрыемстваў.

Кіраўніцтва рэспублікі сур'ёзна вывучае падыходы да стварэння на беларуска-польскім прыгранічча свабодных эканамічных зон і іншых нетрадыцыйных форм супрацоўніцтва. Адзін з прыкладаў — пагадненне аб выкарыстанні порта Гдыня ў якасці беларускага акна ў сусветны гандаль. Перспектыўнымі ўяўляюцца і праграмы супрацоўніцтва Брэсцкай і Гродзенскай абласцей з Беластоцкім, Бяла-Падляскім ваяводствамі. Наспела пытанне і аб пашырэнні супрацоўніцтва ў галіне інфармацыі і кнігавыдання. Такі канспектыўны пералік праблем, што закраналіся ў час размоў.

А ўжо раніцай наступнага дня самалёт з беларускай дэлегацыяй узяў курс на Кракаў. Старшыня парламента рэспублікі і члены дэлегацыі наведалі былы канцэнтрацыйны лагер Асвенцім. Яны ўшанавалі памяць загінуўшых беларусаў, палякаў, грамадзян іншых нацыянальнасцей, знішчаных у час другой сусветнай вайны. Да Сцяны смерці быў ускладзены вянок.

(БЕЛТА).

РАДЫЁФАКТ

Першага ліпеня ўступае ў сілу Закон Рэспублікі Беларусь аб прыватызацыі жылля. Урад зацвердзіў палажэнне аб прыватызацыі жыллёвых памяшканняў у дамах дзяржаўнага і грамадскага фонду. У дакументе адзначаецца, што гэтая кампанія будзе праводзіцца выключна на добраахвотных пачатках. Устаноўлены стартавыя квоты. Так, кошт аднаго квадратнага метра жылля, які склаўся ў 1991 годзе і ў адпаведнасці з якім будзе рабіцца індэксацыя жыллёвай квоты для ўсіх, каму яна неабходна, роўны 491 рублю. Базавая квота на кожнага грамадзяніна Рэспублікі Беларусь роўная 465 рублям. І нарэшце, сума, якая будзе прыпадаць на аднаго працоўнага дарослага члена сям'і, або год працоўнага стажу, складзе 110 рублёў. Формула прыватызацыі будзе выглядаць прыкладна так: базавую квоту неабходна памножыць на колькасць членаў сям'і і дадаць да сумы, якая атрымаецца ў выніку кампенсацыі за працоўны стаж. Затым, калі стане вядомы кошт вашай кватэры, вы зможаце атрымаць розніцу, якую і прыйдзецца выплачваць дзяржаве.

Як паведаміў праграме «Радыёфакт» міністр жыллёва-камунальнай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь В. Батура, прыватызацыйныя квоты атрымаюць усе ўладальнікі жылля прыватнага і ведамаснага, а таксама дамоў у вёсцы.

Льготы на прыватызацыю атрымаюць тыя, хто прадугледжаны беларускім заканадаўствам.

***

У Мінгарсавеце прайшла навукова-практычная канферэнцыя па праблемах рынку працы і палітыкі занятасці насельніцтва горада. Дадзены аналіз становішча рынку працы, падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі рабочых і спецыялістаў. Размова ішла таксама аб абароне сацыяльных і прафесіянальных правоў працоўных.

***

У Гомелі зноў паяўляюцца прыметы напружанасці ў забеспячэнні грашовай масай работнікаў прадпрыемстваў, а таксама пенсіянераў. У некаторых месцах ужо адчуваецца недахват нават разліковых білетаў Рэспублікі Беларусь.

***

Банкі Літвы спынілі продаж валюты. Валютны бум у суседзяў выкліканы ўвядзеннем уласных грошай. Няцяжка здагадацца, куды цяпер накіруюцца мянялы з Вільні. Можа, і нам ёсць сэнс падумаць аб тым, каб рэшткі валюты не сплылі?

***

Імем героя старажытнай міфалогіі названы новы прадукт, выпуск якога пачаў Бярозаўскі сыракамбінат. «Антэй» — такая яго назва — вырабляецца з малочных кампанентаў у выглядзе парашку і таблетак і садзейнічае хуткаму аднаўленню арганізма пасля фізічных і нервовых перагрузак. Спецыялісты-дыетолагі і медыкі лічаць, што ён унікальны па сваіх якасцях.

***

На дзяржаўнай граніцы паблізу Брэста прадухілены вываз кантрабанды на суму каля 600 тысяч рублёў.

У злачынны камерцыйны абарот у апошні час тут уцягваюцца сотні кілаграмаў, нават тоны каляровых металаў, ртуці, медзі, рэдказямельных элементаў, натуральных лекавых прэпаратаў.

***

У Цэнтральны раённы аддзел унутраных спраў Магілёва звярнуўся рабочы хлебазавода і заявіў, што 21 чэрвеня а 23-й гадзіне каля гасцініцы «Магілёў» ён пазнаёміўся з мужчынам і дзвюма дзяўчатамі, якіх запрасіў да сябе. Дома, пасля таго, як яны ўсе разам выпілі, госці пад пагрозай ножа, звязалі яго, закрылі ў ванным пакоі, укралі рэчы на суму каля 30 тысяч рублёў і ўцяклі. Устаноўлена, што злачынства зрабілі Аксана з Краснадарскага краю і Вольга з Рэспублікі Башкортастан.

***

26 чэрвеня высветліцца, хто ўпершыню стане ўладальнікам залатых медалёў нацыянальнага чэмпіянату Рэспублікі Беларусь па футболу. Усё будзе залежаць ад выніку матчаў «Дынамо» (Мінск) — «Ведрыч», «Днепр» — «БелАЗ». Пакуль у мінчан на ачко больш, але магіляўчане, вядома, тэарэтычна, захоўваюць шанцы на перамогу.

І яшчэ адзін факт з футбольнага жыцця рэспублікі. Галоўны трэнер мінскага «Дынамо» Міхаіл Вяргеенка зацверджаны выконваючым абавязкі галоўнага трэнера нацыянальнай зборнай Беларусі. Галоўным трэнерам алімпійскай зборнай зацверджаны Іван Савосцінаў.

***

24 чэрвеня ў Алма-Аце пачалася нарада прадстаўнікоў жыллёва-камунальнай гаспадаркі дзяржаў СНД. Размова ідзе аб тым, як выйсці галіне ў гэтых складаных, пераходных да рынку ўмовах.

Удзел у нарадзе прымае таксама дэлегацыя Рэспублікі Беларусь.

Стаіць цудоўнае надвор'е. Лепшага для нарыхтоўкі кармоў не бывае. Гэта добра разумеюць у калгасе «Чырвоны сцяг» Дзяржынскага раёна і таму, не губляючы марна часу, імкнуцца як мага больш назапасіць сена і сенажу для грамадскага статка. Не застаюцца без увагі і іншыя справы — догляд за пасевамі буракоў, кукурузы, бульбы, ідзе таксама падрыхтоўка да жніва. А ўраджай у гаспадарцы чакаецца добры.

НА ЗДЫМКУ: бягучыя справы абмяркоўваюць намеснік старшыні калгаса Валерый ВАЗНЯК, аграном-насеннявод Яўген ЯСЬКЕВІЧ, механізатары Уладзімір НАРЭЙКА і Аляксандр ЦАРУК.

Фота Мікалая АМЕЛЬЧАНКІ.

Старыя традыцыі ў новай духоўна-асветніцкай газеце

ГРОДНА. У год святкавання 1000-гадовага юбілею Праваслаўнай царквы на Беларусі зноў адноўленая Гродзенская епархія Беларускага экзархата распачала выданне «Гродзенскіх епархіяльных ведамасцей», працягваючы традыцыі нашых продкаў. Духоўна-асветніцкая газета будзе выходзіць штомесячна і распаўсюджвацца ў царквах. Так што застаецца толькі павіншаваць і веруючых, і неверуючых з новым выданнем.

ПАМЯЦІ ПЕСНЯРА

У старажытным Навагрудку праходзіць міжнародны сімпозіум «Сустрэчы на Свіцязі» як адзін з этапаў падрыхтоўкі да святкавання 200-годдзя Адама Міцкевіча. У канферэнцыі ўдзельнічаюць вядомыя беларускія навукоўцы, літаратары, госці з-за мяжы — з Польшчы, Злучаных Штатаў Амерыкі, Канады, Францыі. Шырока абмяркоўваецца творчасць вялікага паэта, а таксама пытанні, якія датычаць юбілею і перспектыў развіцця горада як культурнага цэнтра. Удзельнікі сустрэчы выказалі меркаванне, што 1998 год ЮНЕСКО павінен аб'явіць годам Адама Міцкевіча.

НЯЎДЗЯЧНЫ СЫН

КАРЭЛІЧЫ. (А. Дук). У вёсцы Заполле трактарыст калгаса «Маяк» падпаліў хату, якая належала яго маці. У выніку пажару ўся маёмасць згарэла.

ПЕРАРЭГІСТРАЦЫЯ КАМУНІСТАЎ

Аргкамітэт па стварэнню Партыі камуністаў Беларусі Шклоўскага раёна звярнуўся да «ўсіх камуністаў і аднадумцаў сацыялістычнага выбару» Шклоўшчыны з заклікам пацвердзіць сваё членства ў ПКБ шляхам перарэгістрацыі альбо ўступіць у нядаўна зарэгістраваную партыю. З гэтай мэтай ужо адчынены раённы пункт па перарэгістрацыі членаў ПКБ, які, дарэчы, знаходзіцца ў былым будынку райкома КПБ.

***

А вось былы першы сакратар Бялыніцкага райкома КПБ Анатоль Глаз заняўся мецэнацтвам. Ён прынёс у рэдакцыю раённай газеты «Зара над Друццю» 100 (сто) рублёў і прапанаваў іх у фонд падтрымкі газеты. Дарэчы, такую ж суму ён нядаўна ахвяраваў і на падтрымку абласной газеты «Магілёўская праўда», пастаянным аўтарам і чытачом якой ён з'яўляецца.

***

Створана пярвічная арганізацыя ПКБ і ў Краснаполлі. Яе кіраўнік А. Лазука ў інтэрв'ю раённай газеце «Голас Краснапольшчыны» (некаторыя супрацоўнікі якой, дарэчы, актыўна падтрымліваюць партыю камуністаў) заклікаў чытачоў выпісваць газеты «Правда», «Мы и время» і штотыднёвік «Гласность», а таксама пазбягаў, што мясцовыя камуністы выпрацуюць «сваё бачанне праблем раёна і іх правядзенне ў жыццё».

Станіслаў Шушкевіч аб бягучым моманце

ІНТЭРВ'Ю СТАРШЫНІ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ КАРЭСПАНДЭНТУ АГЕНЦТВА «ІНТЭРФАКС»

— Станіслаў Станіслававіч! Вы ўжо расказвалі журналістам пра свае адносіны да рэферэндуму аб даверы да парламента. Ён, напэўна, адбудзецца. Як Вы лічыце, у выпадку магчымай адстаўкі цяперашняга Вярхоўнага Савета новыя выбары сапраўды будуць праводзіцца па распрацаваным парламенцкай апазіцыяй законе?

— Нельга дапускаць абсурду. Перакананы: цяпер самай галоўнай задачай з'яўляецца прыняцце новай Канстытуцыі. А ўжо выходзячы з яе палажэнняў, на мой погляд, павінен распрацоўвацца новы закон аб выбарах. Работа над праектам Асноўнага закона незалежнай Беларусі ўжо завяршаецца. Ён прайшоў «абкатку» ў парламенцкіх камітэтах і камісіях, яго аналізавалі буйнейшыя ў свеце спецыялісты ў галіне права—эксперты Еўрапарламента. На 26 старонках дробным почыркам прафесіяналы з сусветным імем па кожным пункце кожнага артыкула новай Канстытуцыі ўнеслі свае заўвагі. Усе яны ўлічваюцца, аналізуюцца, у дакумент уносяцца адпаведныя карэктывы. Такім чынам, з пункту гледжання міжнародных нормаў наша новая Канстытуцыя фактычна бездакорная.

Такім жа бездакорным павінен быць і новы закон аб выбарах. Трэба прызнаць: ранейшы дакумент быў тэндэнцыйным, у многім меў рысы старой сістэмы. Цяпер мы дочам стварыць новы, дэмакратычны. Але пагадзіцеся, што лідэры апазіцыі са сваімі экспертамі, якія распрацоўваюць свой варыянт закона аб выбарах, не здолеюць зрабіць яго больш сучасным з пункту гледжання міжнароднага права, чым гэта можам зрабіць мы, паколькі і тут нам дапамогуць еўрапарламенцкія спецыялісты. Распрацоўшчыкі закона аб выбарах ад апазіцыі самі далёка не прафесіяналы, а аматары, энтузіясты. І эмацыянальнае ўспрыманне ў іх пераважае над прафесіянальным. Ствараецца ўражанне, што лідэры апазіцыі гэтага не хочуць разумець. Але, захопленыя ўласнай ідэяй, яны ўсё роўна павінны правесці свой законапраект праз усе парламенцкія працэдуры. Толькі тады гэты дакумент можа быць прыняты. А пакуль гэта толькі гульня ў палітыку, жаданне сутыкнуць ілбамі людзей, якіх мы не маем права, прабачце, дурыць!..

Канстытуцыя будзе прынята ў бліжэйшы час. Тады пагаворым і пра новы закон аб выбарах.

— Вы хочаце сказаць, што рэферэндум будзе праводзіцца толькі пасля прыняцця новай Канстытуцыі?

— Не, я гэтага не сцвярджаю. Але лічыў бы гэта лагічным.

Тут важна не грэбаваць воляй зацікаўленых людзей (маецца на ўвазе больш як 400 тысяч чалавек, якія выказаліся за правядзенне рэферэндуму з пытаннем, толькі што сфармуляваным лідэрамі апазіцыі, — «ІФ»). Ва ўсякім выпадку новы закон аб выбарах павінен быць прыняты канстытуцыйна, парламентам, і толькі тады можна гаварыць аб новых выбарах. Адзначу: тут Вярхоўны Савет не збіраецца праводзіць палітыку адцягвання. Цяпер ідзе работа над новым законам аб выбарах, узгодненым з новай Канстытуцыяй. Але яго можна прывязаць і да старой Канстытуцыі. Тут праблем няма, але што лепш?..

Што дасць адстаўка парламента і ці будзе яна? Вы ведаеце, цяперашні Прэзідыум Вярхоўнага Савета, дэпутаты праяўляюць у нейкай меры велікадушнасць у тым, што не шукаюць фармальных зачэпак для адмены рэферэндуму. Толькі фармальнымі зачэпкамі можна б было спыніць рэферэндум. Але мы будзем вышэй за гэта. Няхай нават вынікі ўсенароднага галасавання пакажуць недавер народа да Вярхоўнага Савета і ўрада, адстаўкі можа не адбыцца. Пачытайце ўважліва Закон аб рэферэндуме! Згодна з ім, парламент прымае рашэнне аб тым, якім быць характару рэферэндуму — «кансультатыўным» ці «абавязковым».

— Прабачце, Станіслаў Станіслававіч, за, напэўна, не зусім карэктнае пытанне. Калі адстаўка цяперашняга Вярхоўнага Савета ўсё ж адбудзецца, чым Вы будзеце займацца?

— Кожны чалавек, які займаецца палітыкай, заўсёды павінен быць гатовым да таго, што яго хтосьці заменіць. У мяне ёсць прафесія. Шчыра кажучы, бывае настальгія па ранейшай рабоце. Канешне, за гады работы ў палітыцы, я вельмі моцна страціў у кваліфікацыі, і я гэта разумею. Выкладаць студэнтам —вельмі адказная справа. Але, спадзяюся, я гэта здолею.

У нас няма прафесіянальных палітыкаў. У асноўным, палітыкай займаюцца людзі, якія не валодаюць дастаткова высокай кваліфікацыяй. Да іх ліку адношу і сябе. У многіх прэтэнзій значна больш, чым кваліфікацыі...

— Давайце пагаворым аб знешняй палітыцы. Як вы лічыце, чаму на тэрыторыі былога СССР так шмат «гарачых кропак»?

— На мой погляд, гэта вынік не заключаных у свой час двухбаковых дагавораў паміж рэспублікамі. Інтарэсы пражываючых за межамі Расіі расіян менавіта з-за гэтага абараняюцца цяпер не з дапамогай законных урадаў на гэтых тэрыторыях, а з дапамогай расійскіх узброеных сіл. Я маю на ўвазе сітуацыю ў Прыднястроўі. Нешта падобнае адбываецца ў Грузіі, Нагорным Карабаху. Раней гэта было ў Прыбалтыцы. Але давайце ўдумаемся, ці можна абараняць інтарэсы расіян, мінаючы гэтыя ўрады? Калі яны законныя, канстытуцыйныя, трэба з імі весці перагаворы і вырашаць усе пытанні.

Беларусь, напрыклад, гарантуе захаванне інтарэсаў расіян, прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцей на сваёй тэрыторыі. Нам не трэба, каб пра іх тут, апрача законных уладаў рэспублікі, яшчэ хтосьці клапаціўся. І гэта павінна замацоўвацца адпаведнымі двухбаковымі пагадненнямі. Такая сістэма даўно ўжо існуе ва ўсім цывілізаваным свеце, яна, можна сказаць, выпакутаваная сусветным грамадствам. Існуе ж Дэкларацыя правоў чалавека, Хельсінкскае пагадненне, Парыжская хартыя, іншыя міжнародныя дакументы, выходзячы з палажэнняў якіх можна выпрацаваць дастаткова дэмакратычнае, юрыдычна граматнае пагадненне.

Беларусь цяпер распрацоўвае некалькі двухбаковых пагадненняў рознай тэматыкі і з рознымі дзяржавамі. Напрыклад, «ваеннае» пагадненне з Расіяй.

— У ім узнікла вялікая неабходнасць?

— На мой погляд, вельмі вялікая. З развалам СССР у многіх галінах жыццядзейнасці рэспублік стварэцца прававы вакуум. Яго тэрмінова трэба запаўняць. У памянёным мной «ваенным» пагадненні мы павінны вызначыць механізм пераходу пад юрысдыкцыю Расіі падраздзяленняў стратэгічных сіл, размешчаных на тэрыторыі Беларусі. Праблем тут узнікае шмат: як ядзерныя ракеты стратэгічнага прызначэння будуць выводзіцца адсюль, як будзе вырашацца лёс ваеннаслужачых, што іх абслугоўваюць, як наладзіць іх пенсіённае забеспячэнне?

Бываюць складанасці. На жаль, на першым этапе ўзнікалі пэўныя праявы расійскай велікадзяржаўнасці з боку асобных высокапастаўленых службовых асоб Міністэрства абароны Расіі. Без ведама нашага ваеннага ведамства яны прыязджалі да нас і вялі пэўныя размовы. Мы заявілі рашучы пратэст з гэтай нагоды і атрымалі запэўніванні, што больш гэтага не будзе.

— Станіслаў Станіслававіч, ці не ўзніклі ў Вас, як у кіраўніка беларускай дзяржавы, пытанні, звязаныя з аказаннем якой-небудзь дапамогі адзнаму з бакоў у «гарачых кропках»?

— Ваеннае ўмяшанне з боку Беларусі ў гэтай сітуацыі выключана пры любых абставінах, бо гэта супярэчыць нашаму заканадаўству. Але пасільную дапамогу ва ўрэгуляванні канфліктаў палітычным шляхам Беларусь заўсёды гатовая аказваць любой дзяржаве.

Бачыце, «былы СССР» — гэта не абстрактнае паняцце. Мы былі яго суб'ектамі, а значыць, і маем права лічыць сябе саўдзельнікамі тых або іншых непаразуменняў, якія ўзнікалі пасля развалу Савецкага Саюза. Мы павінны садзейнічаць ліквідацыі гэтых непаразуменняў.

Ні прамой, ні ўскоснай дапамогі па разгортванню ваенных дзеянняў у «гарачых кропках», узмацненню ваеннага процістаяння Беларусь не аказвае. Ва ўсякім выпадку, я аб гэтым нічога не ведаю. Пазіцыя нашай рэспублікі дастаткова цвёрдая— Беларусь мае справу выключна з законнай канстытуцыйнай уладай іншых дзяржаў, ніякіх кантактаў з неканстытуцыйнымі ўтварэннямі і на дзяржаўным узроўні, напрыклад, з той жа Прыднястроўскай Рэспублікай, мы не маем. Калі Беларусь афіцыяльна прызнала Малдову, мы ўстанавілі паміж сабой добрыя адносіны, значыць, павінны паважаць яе ўрад.

— А цяперашняе кіраўніцтва Грузіі вы лічыце законным?

— Не. Я лічу яго незаконным. Яно не выбіралася народам. Заўважу: і ў СНД да Грузіі ў сувязі з гэтым адносіны адпаведныя. Што ж гэта за дэмакратыя, якая шляхам кровапраліцця прыйшла да ўлады, звергнуўшы законную, канстытуцыйную ўладу? Калі ў Грузіі пройдуць новыя выбары — тады пабачым.

Гутарыў Вячаслаў ЗЯНЬКОВІЧ.

СУБ'ЕКТЫЎ

МЫ—НЕ РАБЫ! РАБЫ—НЕ МЫ?

Чыста асабістыя разважанні аб свабодзе і рабстве

У амерыканцаў — новая тэорыя. Згодна з ёю, чалавек, які мала зарабляе, з'яўляецца сацыяльна небяспечным. Інакш кажучы, ад яго можна чакаць чаго хочаш. Ён, напрыклад, можа (во, грэх!) працаваць на дзвюх работах і нідзе не спраўляцца. Ці, наогул, пайсці на вялікую дарогу і там здабываць свой долар. Усё так. Амерыканцы — нацыя маладая і працягваюць адкрываць даўно вядомае ў выглядзе навуковых тэорый. Уладзімір Іванавіч Даль, скажам, прыводзіць у сваім «Тлумачальным слоўніку жывой вялікарускай мовы» такія прыслоўі: «І бедны ўкрадзе, ды Бог даруе», ці яшчэ больш адметнае: «Бедны па чужому сумуе». У чатырох словах — уся навамодная тэорыя. Ах, якая яна актуальная для нас...

Па амерыканскай тэорыі — усе мы (ну, 95 працэнтаў — гэта ўжо напэўна) сацыяльна небяспечныя тыпы. З намі ў глухім завулку бліжэй да ночы лепш не сустракацца. Таму што, калі мы зарабляем 5 тысяч, то нам не хапае на халадзільнік, калі 50 — «на «Мерседэс», калі 150 — на ўчастак у Фларыдзе. Сярэдзіны мы не ведаем, яе ў нас проста няма, у нас толькі верх — паны і ніз— рабы. Наогул, і нашы паны — не паны, а тыя ж рабы з высокім узроўнем даходу і вялікімі магчымасцямі. Словы Аляксандра Іванавіча Герцэна «рабы, рабы, уся нацыя зверху данізу — рабы» ні ў якім разе не страцілі актуальнасці. Ленін любіў прыводзіць гэты выраз Герцэна, якога, як вядома, абудзілі дзекабрысты. І пельмі, трэба заўважыць, пасляхова прадоўжыў стан рабства яшчэ на 70 з лішкам гадоў.

Кажуць, пасля жніўня 91-га мы сталі свабодныя, сацыялістычнае прыгоннае права было адменена. Смяяцца з гэтага смелага сцвярджэння грэх, ды і небяспечна — могуць не так зразумець. А я ўсё ж пасмяюся.

Уявім сітуацыю. Вы ішлі, ішлі і ляснуліся, прабачце, на роўным месцы. Пашкодзілі нагу. Ідзяце да траўматолага, як вам казалі, выдатнага спецыяліста. Ён вас выдатна агледзіць — і бальнічнага не дае. «Чаму? — абурацеся вы. — Доктар, вы ж бачыце, я да вас у кабінет па-пластунску запоўз, у чым справа?» Доктар адводзіць вочы і бубніць нешта незразумелае. Доктару далі ўказанне: менш бальнічных, эканоміка ў крызісе, трэба працаваць. Доктар разумее, вам не толькі бальнічны, вас на аперацыю трэба было б, але ў яго могуць быць непрыемнасці, а хто да іх імкнецца? Не дай Бог звольняць — куды ісці? Так, ён выдатны знаўца сваёй справы, аднак і знаўцу можна пасадзіць на кароткі павадок. Зарплатай, пенсіяй, немагчымасцю адкрыць сваю практыку і многім, многім іншым. Раб ён, наш доктар. А яму ж казалі —ты свабодны (на табе кавалак, толькі не гаўкай).

Мяне ўвесь час цікавіла: чаму мы не можам без цара? Добрага ці ката — але цара? Не паспелі закапаць аднаго, а ўжо молімся на другога. Ну, вось гэты, такі мілы, усмешлівы, гаваркі, сківіцы не грымяць, — вось ён нас выцягне, надзея наша, цар-бацюхна, памолімся, людзі. Час прыйшоў: і гэтага закапалі, знялі, закідалі слоўным гноем — чакаем новага прышэсця. Прыйшоў яшчэ лепшы, з бюракратамі распраўляецца, толькі пер'е ляціць, абяцае стабілізацыю і кожнаму па машыне ўжо да восені. А мы жывём усё горш. А мы—зубы на паліцу і падумваем: і гэты, гад, туды ж, няма праўды-матухны, няма.

Усё мне растлумачыў Святаслаў Фёдараў, наш савецкі капіталіст і ўрач-афтальмолаг. Кім быў наш продак? — пытаўся ён у адным інтэрв'ю. Паляўнічым, здабытчыкам — тлумачыў. Бегаў па палях і гарах з кап'ём і паляваў. Ні партком, ні адміністрацыя, ні трэст, ні міністэрства яму заданняў не давалі і не наглядалі, ці правільна ён цаляе камнем у лоб маманту. Ён хацеў жыць. А каб жыць, разумеў ён без вышэйшай адукацыі, трэба ўдала паляваць. Адпаведна спадзяваўся на сябе і толькі на сябе. Напалюеш — будзеш жыць.

Я, канешне, не лічу, што так і нам трэба. Справа больш глыбокая. Справа ў інстынкце здабытчыка, якога нас мэтанакіравана і зусім свядома пазбаўлялі. І пазбавілі.

Наш інтарэс перамясціўся з сябе на начальніка. Назначылі новага — курым па кутах і абмяркоўваем: злы ці добры, дурань ці разумны. Потым разбіваемся на тройкі, «абмываем» падзею. Ранкам — цярплівая, ціхая, вінаватая чарга за півам. Заглынулі дозу — і з цяжкай галавой на работу, дзе высвятляецца, што начальнік як начальнік, што дасць ён нам не больш таго, што яму дазволілі даць. Дазволяць больш — дасць больш. І пацякло далей бясконцае, нуднае, шэрае жыццё. Безвыходнае. Час—ноч.

І ці не ўсё роўна: хто там зараз залез на трон, Міхаіл Сяргеевіч ці Барыс Мікалаевіч, — ранкам мы п'ём піва...

Ну запярэчце мне, скажыце — ёсць! Ёсць і ў нас свабодныя людзі. І пакажыце мне іх. Я ведаю, каго вы мне пакажаце. І скажу каменным голасам: га-га-га. У рабскай краіне не можа быць свабодных людзей. Ва ўсякім разе на гэтую ролю нашы бліскуча-правінцыяльныя нуварышы прэтэндаваць не могуць. Калі я гляджу, як яны (ці яна) свабодна задзіраюць ногі на стол ці спадніцу да пупа перад тэлекамерай, як смела і рэвалюцыйна пускаюць цыгарэтны дым у нос рэпарцёра, з якім апломбам і гонарам паведамляюць шэрай рабскай масе аб сваіх «праэктах»,— мяне разбірае здаровы смех, і я думаю: не, гэта яшчэ не свабода. Гэта называецца інакш — разбэшчанасць і тое, што французы маюць на ўвазе, калі гавораць: маветон (дрэнны тон). Уся іх свабода — для кабакоў, дзе яны могуць купіць банкетную залу, афіцыянтаў, задастых дзевак, міліцыянераў. Нямнога.

А ўдзень яны курсіруюць па канторах і кабінетах з даволі прыніжаным выглядам, просяць, раздаюць направа-налева хабар — ажыццяўляюць фінансавую дзейнасць. А ўсё таму, што маленькі такі, ціхенькі Іван Іванавіч, аб якога і ў сваёй канторы выціраюць ногі, можа не паставіць подпіс пад патрэбнай — кроў з носу! — паперкай. І канец свабодзе. Так што ўсё вельмі і вельмі адносна.

Вы можаце скупіць увесь горад ад старшыні выканкома да прыбіральшчыцы таго ж выканкома, ездзіць на уік-энд на Гаваі, — поўнага спакою не будзе. Пачнецца кімсьці запланаваны і вылічаны «землятрус», зменіцца ўлада і зноў прыйдзецца ўступаць у ВКП (б). Эх, жытка сабачая, як кажа мая цешча...

Прыемна «ўпакаваны» малады чалавек кіўае мне на Захад. Малады чалавек горача верыць, што свабоду можа нам прынесці статуя Свабоды на чале з Дж. Вашынгтонам. Апошні нават хутчэй, бо яго горды твар намаляваны на доларавай купюры. Ну, што ж, абмяркуем і гэту цікавую магчымасць.

Па-першае, вы, малады чалавек, сапраўды верыце, што ў Вашынгтоне сядзяць добрыя дурні і льюць горкія слёзы над нашым няшчасным лёсам? Не. Там дагэтуль не могуць паверыць, што магутны сапернік на Усходзе — разваліўся-такі. Ракеты мы пускаць, верагодна, ужо не будзем, але, калі станем на ногі, то будзем хто? Правільна, зноў сапернік.

Калі амерыканцам пасля вайны спатрэбілася процівага Сталіну, то ўзнік план Маршала і Германіі дазволілі перажыць эканамічны бум. Ну, а мы ім хто? Тым больш мы, беларусы, якіх дагэтуль блытаюць там з якутамі? Так што пан амерыканскі пасол можа (паводле яго слоў) заняцца вывучэннем нашай гісторыі і літаратуры. А свабоды ён нам не дасць. І рэформы за нас праводзіць не будзе. І выціскаць з нас па кроплі раба таксама не стане.

Свабода, мне здаецца, наогул катэгорыя інтымная, асабістая. Ніякага знешняга ўціску не церпіць. Нельга сказаць: свабодны народ, гэта абсурд. Можна і трэба гаварыць: свабодны Сміт, свабодны Іваноў.

Ну, а цяпер пачнуцца старыя песні. Як гаворыцца, «гэты стогн у нас песняй завецца». Я сам аб гэтым столькі пісаў, што сэрца спыняецца, як падумаю — трэба зноў. Трэба зноў пісаць, што без свабоды эканамічнай ніякай увогуле свабоды не бывае. Вось толькі сёння да мяне прыйшлі камерсанты. Суткасць іх справы — я ды ўсе ведаюць, надакучыла. Есць цікавая задумка і, какешне, яе зацісналі. Ну, а чым я дапамагу? — пытаюся. Не ведаем, але ўсе астатнія ступені прайшлі неаднойчы. Вось гэта ёсць эканамічная несвабода. Што значыць яе процілеглае значэнне— мы, на жаль, не ведаем. І не скора, ой, баюся накаркаць, даведаемся. З нашымі правадырамі. Баюся, гэта здарыцца толькі тады, калі ўся чыноўная прорва «напрыватызуецца» дзяржмаёмасцю. Тады можна аб'яўляць эканамічную свабоду, тады — добра, гуляй, брата. На зліванні ўсе мёд п'юць... У каторых, праўда, толькі па барадзе цячэ.

Так што не ведаю, як вы, паважаныя чытачы, а я даўно не слухаю гістарычных прамоў нашых правадыроў, і мяне не цікавіць, хто з іх увойдзе ў гісторыю, а хто не, хто з іх што сказаў з нагоды чарговай п'янкі сантэхніка Пятрова, а хто гэту падзею праігнараваў. Ды і якія яны мне правадыры? Я іх не прасіў і прасіць не збіраюся. Для іх рабоў і без мяне хопіць. Прыміце і інш.

Сяргей ШАЎЦОЎ.

Літаральна ва ўсіх раёнах вобласці пабыў з канцэртамі фальклорны ансамбль «Прыдняпроўскія сяброўкі» магілёўскага Дома культуры чыгуначнікаў. Самадзейныя артысты выступалі ў Мінску, ездзілі на гастролі ў Балгарыю і Германію. І ўсюды — поспех і цёплы прыём.

У праграме выступленняў — беларускія народныя мелодыі, частушкі, абрады. Удзельнікі ансамбля — людзі розных узростаў, аднак з году ў год аддаюць імі вольны час любімаму захапленню — народнай песні.

НА ЗДЫМКУ: удзельнікі ансамбля Наталля ГРУДЗІНА і Ула дзімір БУРКАНАЎ.

Фота Яўгена КАЗЮЛІ. (БЕЛТА).

ВАЧАМІ САЦЫЁЛАГА

6. Прадпрымальніцтва

(Працяг. Пачатак у №№ 119, 120, 122—124)

Тых, хто стаў прадпрымальнікамі, пакуль што мала — 4,6 працэнта. Жадаючых больш — 39,4. Але, калі гаварыць пра псіхалагічныя ўстаноўкі, то і гэта лічба не ўражае. Бо астатнія, а іх пераважная большасць, згодны на наёмную працу. У пераліку перашкод у рэалізацыі прадпрымальніцкіх установак названы адсутнасць сувязей, недастатковасць ведаў, нестабільнасць у рэспубліцы, адсутнасць грошай, няведанне механізма прыватызацыі, рэгістрацыйная фармальнасць, боязь рэкету. Усяго толькі 9,2 працэнта не бачаць перашкод на шляху вырашэння сваіх жаданняў.

Грашовыя збяражэнні на момант апытання (сакавік—красавік 1992 года) мелі 34,2 працэнта апытаных. Фінансавыя намеры людзей істотна змяніліся: у 7 разоў павялічылася колькасць жадаючых купіць валюту, у 4 разы зменшылася доля патэнцыяльных акцыянераў і г. д. У многім гэта можна растлумачыць усё яшчэ нестабільнай фінансавай сістэмай рэспублікі.

1. ЦІ ХАЦЕЛІ Б ВЫ СТАЦЬ ПРАДПРЫМАЛЬНІКАМІ?

1. Так	39,4
2. Не	52,2
3. Ужо стаў	4,6
4. Няма адказу	3,8

2. КАЛІ ХОЧАЦЕ, ТО ЯКІЯ ПЕРАШКОДЫ Ў АЖЫЦЦЯЎЛЕННІ ГЭТАГА ЖАДАННЯ ВАС СПЫНЯЮЦЬ (у працэнтах да ліку жадаючых стаць прадпрымальнікамі)

1. Такіх няма	9,2
2. Адсутнасць неабходных ведаў	57,6
3. Адсутнасць грошай	35,6
4. Няма сувязей у гандлі	79,6
5. Апасаюся нестабільнасці ў рэспубліцы	49,4
6. Ржэт	12,3
7. Рэгістрацыйныя фармальнасці	17,1
8. Няведанне механізма прыватызацыі	24,5

3. ЦІ ЁСЦЬ У ВАС ГРАШОВЫЯ ЗБЕРАЖЭННІ?

1. Так	34,2
2. Не	63,3

4. КАЛІ ЁСЦЬ, ТО Ў ШТО Б ВЫ СЁННЯ ПАГАДЗІЛІСЯ ІХ УКЛАСЦІ?

1. У акцыі прадпрыемстваў	6,5 (24,3)
2. У пакупку кватэры, дома	21,5 (29,1)
3. У пакупку зямельнага ўчастка	9,2 (15,9)
4. На новыя формы страхавання	0,3 (5,0)
5. У замежную валюту	8,7 (1,2)
6. У прадпрымальніцтва (пакупку магазіна, лазні, майстэрні і інш.)	10,6 (8,0)
7. На набыццё бытавых тавараў (мэбля, адзенне, электратэхніка, аўтамабіль і інш.)	24,6 (15,2)

(Працяг будзе).

КАМЕНТАРЫЙ ЭКАНАМІСТА

Рэцэпты ўрада. Ці падымецца хворы?

Прэзідыум Савета Міністраў Беларусі нядаўна разгледзеў і адобрыў «Асноўныя напрамкі палітыкі ўрада Рэспублікі Беларусь па прадухіленню спаду вытворчасці і фарміраванню ўмоў выхаду з крызісу». Аналізуе гэты дакумент загадчык аддзела Інстытута эканомікі АН Беларусі, доктар эканамічных навук В. КЛЕЦКІ.

Ва ўказаным дакуменце зроблена разгорнутая ацэнка эканамічнай сітуацыі, што склалася ў рэспубліцы, і прапануецца сукупнасць мер па выхаду з крызісу. Сярод іх прадугледжаны шэраг глабальных, што носяць прынцыповы характар і накіраваны на актыўнае ўкараненне рыначных адносін у эканоміку рэспублікі. Да такіх мер можна аднесці наступныя:

— па структурнай перабудове эканомікі рэспублікі ў напрамку згортвання рэсурсаёмістых і энергаёмістых і развіцця навукаёмістых вытворчасцей;

— па зняццю абмежаванняў ва ўстанаўленні прамых камерцыйных сувязей з прадпрыемствамі іншых краін, у стварэнні СП, развіцці прадпрыемстваў недзяржаўных форм уласнасці;

— стварэнню ў рэспубліцы свабодных эканамічных зон;

— актывізацыі працэсаў прыватызацыі, раздзяржаўлення, камерцыялізацыі дзейнасці дзяржаўных прадпрыемстваў;

— стварэнню ўласнай грашова-крэдытнай і фінансавай сістэм, удасканаленню падаткааблажэння прадпрыемстваў;

— узмацненню рычагоў дзяржаўнага рэгулявання эканомікі і шэраг іншых.

Натуральна, з прыняццем указаных «Асноўных напрамкаў...» з'явілася падстава зняць абвінавачванні з боку апазіцыі БНФ у адрас урада аб адсутнасці ў яго распрацаванай праграмы выхаду з эканамічнага крызісу. Пры гэтым варта прызнаць неабходнасць і важнасць паслядоўнай рэалізацыі намечаных мер па «лячэнню» нашай хворай эканомікі. Разам з тым хацелася б больш падрабязна пагаварыць наконт тых аспектаў напрамкаў, якія выклікаюць некаторую незадаволенасць, нараджаюць сумненні.

Наўрад ці гэты дакумент парадуе радавога жыхара рэспублікі, бо прадугледжвае «перагледзець раней прынятыя сацыяльныя праграмы ў напрамку іх патанення» (гл. п. 6.5). Гаворка ідзе пра тыя сацыяльныя праграмы, якія «прыняты без адпаведных абгрунтаванняў, на хвалі папулізму». А што практычна азначае «патанненне» сацыяльных праграм? Адказ адзін: скарачэнне сацыяльных даброс для шырокіх слаёў насельніцтва. І справа не толькі ў тым, што многім давядзецца яшчэ тужэй зацягваць паясы, але і ў тым, што ў такіх умовах непазбежна страчваецца вера людзей у органы ўлады, кіравання, у іх кампетэнтнасць, надзейнасць, стабільнасць прымаемых імі рашэнняў.

У тым жа напрамку будуць дзейнічаць і некаторыя іншыя пункты, такія, напрыклад, як намер павялічыць нарматывы плацяжоў за зямлю, увесці транзітны падатак, «вывучыць мэтазгоднасць змянення цяперашняга маштабу цэн». Апошняе будзе адназначна ўспрынята насельніцтвам як новая небяспека, як сігнал зноў скупляць усе тавары (ратаваць свае грошы).

У нейкай меры супярэчліва выкладзена пытанне аб правядзенні прыватызацыі і раздзяржаўлення прадпрыемстваў. З аднаго боку, абгрунтоўваецца неабходнасць адмовіцца ад нейкай штучнай чарговасці для галін у правядзенні прыватызацыі, указваецца, што прыватызацыяй «павінны быць першапачаткова ахоплены ўсе сферы эканомікі, уключаючы буйныя прадпрыемствы». Аднак ужо ў наступным пункце адзначаецца, што прыватызацыя буйных прадпрыемстваў «патрабуе большага перыяду часу», і таму «для хутчэйшага павышэння эфектыўнасці іх функцыянірання неабходна неадкладна пачаць камерцыялізацыю ўказаных прадпрыемстваў», папярэдні перавод на жорсткі рэжым самафінансавання. А як жа быць з толькі што абвешчанай ідэяй першапачаткова ахапіць прыватызацыяй усе (у тым ліку і буйныя) прадпрыемствы?

Яшчэ больш спрэчнай, увогуле проста няправільнай з'яўляецца абвешчаная ідэя «прапрацаваць пытанне аб прадастаўленні падатковых ільгот для прыватызаваных прадпрыемстваў на перыяд не менш двух гадоў з моманту прыватызацыі». Бо калі прыватызуюцца ўсе прадпрыемствы (у тым ліку і буйныя), дык чаму яны павінны мець падатковыя льготы ў параўнанні з такімі ж дзяржаўнымі? Увесь цывілізаваны свет, што працуе на прынцыпах рыначнай эканомікі, прадугледжвае (з мэтай развіцця канкурэнцыі) падатковыя льготы менавіта для малога бізнесу, г. зн. не па крытэрыю ўласнасці (каму належыць прадпрыемства: прыватніку, кааператыву ці дзяржаве), а па крытэрыю яго размеру. Калі пры ўстанаўленні падаткаў дыферэнцыраваць прадпрыемствы па відах уласнасці, дык як тады забяспечыць неадназарова абвешчаную раней ідэю стварэння роўных умоў функцыянірання для прадпрыемстваў усіх форм уласнасці? Фактычна мы ўжо ішлі падобным шляхам (толькі наадварот): у пачатковы перыяд калектывізацыі далі падатковыя льготы калектыўным і дзяржаўным гаспадаркам, адначасова задушыўшы непасільнымі падаткамі індывідуальныя. Потым абвясцілі аб перавагах калектыўнасці і фізічна знішчылі ў сельскай гаспадарцы прыватны сектар. А калгасы і саўгасы, нягледзячы на прымаемыя 60 гадоў запар меры па іх «умацаванню», так і не здолелі накарміць краіну. Навошта ж паўтараць старыя памылкі, ставячы ў асаблівае становішча нейкую адну з форм уласнасці?

Пры разглядзе пытання аб падатковых ільготах для прыватызаваных (фактычна недзяржаўных) прадпрыемстваў нялішне было б прыгадаць, што зусім нядаўна заканадаўствам прадугледжваліся падобныя ж ільготы вытворчым кааператывам. Аднак гэтыя льготы былі практычна адменены пры ўвядзенні з пачатку гэтага года новай сістэмы падаткааблажэння, у сувязі з чым пачалося згортванне дзейнасці кааператываў. І цяпер многія з іх «дажываюць свой век», чакаюць, калі наступіць іх «трохгадовы юбілей» (ільготны тэрмін), з тым каб не вяртаць дзяржаве прадастаўленыя льготы. Увогуле не трэба замаўваць у прыватызацыю абяцаннямі прадпрыемствам ільгот.

Істотныя прэтэнзіі могуць быць прад'яўлены да прадугледжаных у «Асноўных напрамках...» мер па ўдасканаленню падаткааблажэння прадпрыемстваў. Гэтыя прэтэнзіі зводзяцца да наступнага.

Па-першае, у ліку пералічаных у раздзеле VI важнейшых рычагоў дзяржаўнага рэгулявання эканомікі не названа сістэма падаткааблажэння прадпрыемстваў, хоць указаны антыманапольныя меры, рэгуляванне цэн, грашова-валютнага абарачэння, заработнай платы. Але ж падаткааблажэнне прадпрыемстваў ва ўсіх краінах з рыначнай эканомікай разглядаецца як адзін з важнейшых (калі не самы важны) дзяржаўных інструментаў кіравання эканомікай.

Па-другое, аўтары, відаць, праяўляюць неапраўданы аптымізм, калі заяўляюць, што дзеючы цяпер пакет законаў аб падаткааблажэнні ў асноўным адпавядае рыначнай эканоміцы (хоць і прызнаюць, што ён усё ж мае шмат недахопаў). А калі «ў асноўным» адпавядае, значыць, удакладненні, якія намячаюцца ўрадам,—чыста касметычныя — максімальна магчымая уніфікацыя ставак падаткаў у рамках СНД і карэкціроўка льгот.

Гаворка ж павінна ісці аб стварэнні максімальна простай і зразумелай сістэмы падаткааблажэння, ліквідацыі неапраўданай шматканальнасці спагнання падаткаў, узаемаўвязкі асобных відаў падаткаў, вызначэнні іх максімальнай долі ў атрымліваемым прадпрыемствам прыбытку (бо непасільны падатак, за пэўнымі межамі, становіцца тормазам развіцця вытворчасці) і г. д.

Па-трэцяе, у якасці першачарговай меры ўдасканалення падаткааблажэння прадпрыемстваў-манапалістаў аб'яўлены прагрэсіўны падатак на звышнарматыўны прырост заработнай платы. Аналіз работы прадпрыемстваў у першым квартале дае падставы сумняваецца ў тым, што менавіта тут «закапаны сабака». На абсалютнай большасці прадпрыемстваў фактычны фонд заработнай платы вельмі далёкі ад нарматыўнага ўзроўню (апошні намнога вышэйшы). Так, на абследаваных 26 мінскіх прадпрыемствах розных форм уласнасці налічаная ў першым квартале заработная плата складае ў сярэднім 38,4 працэнта так званага нарматыўнага ўзроўню аплаты працы, а на ніці машынабудаўнічых прадпрыемствах, якія фактычна з'яўляюцца манапалістамі (трактарны, маторны, рысорны, інструментальны, электрамеханічны заводы), яна склала ў сярэднім толькі 28,4 працэнта. Амаль ніхто ў прамысловасці (за выключэннем асобных выпадкаў), не плаціць гэты падатак.

А справа тут у заганнасці метадалогіі налічэння нарматыўнага ўзроўню зарплаты. Галоўны яе недахоп — вызначэнне тэмпаў росту аб'ёмаў вытворчасці (менавіта аб'ёмы закладзены ў разлік нарматыўнага ўзроўню зарплаты прадпрыемства) на базе бягучых цэн. Аналіз вынікаў работы за першы квартал паказвае такую залежнасць: чым большыя цэны на прадукцыю таго ці іншага завода, тым большая ў яго «эканомія» нарматыўнага фонду зарплаты.

Пры гэтым трэба адзначыць, што рост цэн на прадпрыемствах-манапалістах адбываецца не толькі з прычыны падарожання сыравіны, матэрыялаў і камплектуючых вырабаў (на гэта часцей за ўсё спасылаюцца вытворцы), але і ў сувязі з «закладваннем» у цану свайго вырабу больш высокага ўзроўню рэнтабельнасці.

Абсурднасць такога эканамічнага рэгулявання відавочная, яго трэба мяняць. Без гэтага нельга стварыць эфектыўны механізм падаткааблажэння прадпрыемстваў наогул.

РОЗДУМ НАД РЭДАКЦЫЙНАЙ ПОШТАЙ

НЕ СЫПЦЕ ВЕТЭРАНУ СОЛЬ НА РАНУ...

«Перш чым звярнуцца да Вас, паважаная рэдакцыя, я правёў шмат бяссонных начэй, шукаў выйсця са становішча, у якім апынуўся, і не знайшоў...»

Што ж так мучыць інваліда вайны з в. Застарыння Баранавіцкага раёна Міхаіла Васільевіча Баркоўскага? Не дае яму спакою бяда, якая звалілася на яго. І не толькі яна. Вядома, якое здароўе ў пакалечанага ды састарэлага чалавека, а тут яшчэ больш за дзесяць гадоў цяжка хварэе жонка. Лячылася яна ў бальніцах, санаторыях, у хатніх умовах. Набыў Міхаіл Васільевіч і нямала прапанаваных прыбораў. Аднак усё гэта не дало належных вынікаў. Звярнуўся тады ў Маскоўскі інстытут традыцыйнай медыцыны, і там параілі дзейсны сродак. Адным словам, купіў для лячэння жонкі, а таксама сябе магнітафон «Вясна», за які заплаціў 200 рублёў. Але, як бядуе-гаруе інвалід, выйшаў ён са строю. Рамантаваць ніхто нідзе не бярэцца, а купіць новы няма за што: цяпер ён каштуе чатыры тысячы рублёў.

Сапраўды, за што? Жывуць гэтыя хворыя людзі ў сельскай мясцовасці, і, як самі прызнаюцца, можна было б мець якую-небудзь падсобную гаспадарачку, але займацца ёю яны фізічна ўжо не могуць. Існуюць, перабіваюцца на дзвюх пенсіях, якіх хапае на лекі і сціплае харчаванне.

Што і казаць, тупіковая сітуацыя. І можна зразумець роспач і крыўду чалавека, у якога за плячамі 46 гадоў працоўнага стажу. «Я заўсёды цаніў і шкадаваў дзяржаўныя грошы, — заканчвае свой ліст М. Баркоўскі. — Сам будаваў школы і на будпляцоўцы працаваў з раніцы да вечара. Ніколі рубля не атрымліваў па лістках непрацаздольнасці. Лічыў, што атрымліваць грошы не працуючы — злачынства. А калі стаў дырэктарам школы, сам быў і электрыкам, і вартаўніком, і шкляром. За гады сваёй работы для дзяржавы эканоміў дзесяткі тысяч рублёў».

Для чаго прыгадвае ўсё гэта былы педагог? Не, не дзеля таго, каб пахваліцца сваімі заслугамі і бескарыслівасцю. Ён ніколі нічога не прасіў, а цяпер прымусіла жыццё. І зараз пенсіянер-інвалід самаліва просіць, нясмела пытаецца, ці не змог бы які-небудзь завод у якасці гуманітарнай дапамогі выслаць яму такі неабходны для лячэння магнітафон? Чалавек спадзяецца, што яго не пакінуць самнасам з бядой, дапамогуць. У мяне асабіста таксама такая ж думка: як кажуць, свет не без добрых людзей.

І, ведаеце, вельмі добра, што такія людзі сярод нас яшчэ ёсць. Былы франтавік, лётчык Барыс Мікалаевіч Шачыкаў, калі працаваў у вытворчым аб'яднанні «Будіндустрыя», што ў Талачынскім раёне, таксама быў усімі паважаны, меў вялікі аўтарытэт. А пайшоў на заслужаны адпачынак і, як гэта, на жаль, часта здараецца, — адразу ж забылі, быццам яго тут ніколі не было, не існавала. Ах, якая кароткая людская памяць!..

Зараз паралізаваны пенсіянер прыкаваны да ложка. «І ляжаць бы яму ў адзіноце са сваімі цяжкімі думкамі, — паведамляе наш пастаянны аўтар Тамара Махтадуй, — калі б не старшыня первічнай арганізацыі ветэранаў вайны і працы ВА «Будіндустрыя» Фёдар Уладзіміравіч Мядзюк. Разам з такімі ж самымі ветэранамі В. Атрошчанкам і Ц. Ляшнеўскім яны пастаянна наведваюць Б. Шачыкава. Слёзы ўдзячнасці і радасці выступаюць у яго на вачах, што ён не ўсімі пакінуты і забыты».

Увага, падтрымка, цёплае, чулае слова для кожнага пенсіянера як глыток свежага, гаючага паветра. Хто-хто, а Ф. Мядзюк гэта добра разумее. І ветэранская арганізацыя, якую ён узначальвае, як толькі можа стараецца, каб аблегчыць несалодкі лёс яе 66 членаў. У немалой ступені гэтаму спрыяе цесная сувязь з адміністрацыяй аб'яднання. У прыватнасці, яго генеральны дырэктар У. Вадалазкін не эканоміць на ветэранах, якія ў свой час аддалі прадпрыемству сілу і здароўе.

Ды, шчыра скажам, гэтыя пажылыя, хворыя людзі нічога звышнатуральнага не просяць, не вымагаюць. Сапраўды, колькі ім ужо трэба? Дабрацца ў райцэнтр, у бальніцу, паліклініку, аддзел сацзабеспячэння. А многія з іх наогул ледзь ходзяць, ім датупаць на прыпынак, сесці ў аўтобус, высокі кошт білетаў на які сёння не па пенсіённаму кашальку, — праблема з праблем.

Напрыклад, на што крыўдуе, чаго хоча хранічна хворая 68-гадовая М. Меляшчэня з в. Аляксандраўка Калінкавіцкага раёна? Здавалася б, самага элементарнага — каб у яе кватэры было цёпла. І хоць на вуліцы стаіць гарачыня, на письме значыцца дата «1 чэрвеня», а з яго нясе-цягне пранізлівым холадам, як са склепа. «Не жывеш, а існуеш. Катарга, а не жыццё. Жыву на таблетках. З-за пастаяннага холаду ў кватэры (з восені і ўсю зіму тэмпература ў ёй была 8—10—12 градусаў) не здымаю з сябе вопратку і абутак. Называю гэту кватэру «моргам». Толькі ў моргу бывае такі дзікі холад».

І, як вынікае з пісьма, прычына вельмі простая — эканомілі паліва. А тое, што ў «клетках-хрушчоўках» мерзлі 34 сям'і, дзе нямала дзяцей, пенсіянераў, нікога не турбавала. Затое плату за ацяпленне акуратненька пералічвалі ў касу саўгаса «Галявічы».

Састарэлая жанчына, якая 8-гадовай дзяўчынкай перажыла страшны голад 1932—1933 гадоў, затым адпакутавала ваеннае ліхалецце, задае заканамернае пытанне: чаму свае апошнія гады ёй даводзіцца завяршыць у такой беднасці і нішчымніцы, хоць зараз і мірны час? Нарэшце, калі з 1948 па 1980 год працавала медыцынскай сястрой, была ўсім патрэбна, а цяпер усімі забытая. І напісала яна ў «Звязду», каб напомніць, як жыве асобная катэгорыя бездапаможных пенсіянераў.

«У маім разуменні слова «ветэран», — разважае Іван Іванавіч Красуцкі з в. Гасцілавічы Лагойскага раёна, — да нейкага часу азначала штосьці надзвычайнае, даволі працяглае ў дзейнасці чалавека. Ды вось апошнім часам гэта слова страціла свой першапачатковы сэнс і змест».

Чаму аўтар пісьма робіць такі вывад? Скажам, узяць ветэранаў вайны. Сёння нярэдка можна пачуць такое: маўляў, хто ваяваў — той загінуў, а хто застаўся ў жывых, — гэта, ну, проста тыя, што адседжваліся па тылах. Калі б яно было так, то на Эльбе з саюзнікамі сустракаліся б адны тылавікі. Але ж гэта было б супраць ісціны. Відаць, таму да былых франтавікоў, сапраўдных ветэранаў вайны, а таксама працы, нават да інвалідаў у многіх з'явілася элементарная непавага, нават пагарда. «Як нам часам цяжка бывае даказаць у магазіне, — піша інвалід Генадзь Пятровіч Дурэйка з г. Маладзечна, — што ўсё ж маем нейкае права на пазачарговае абслугоўванне. Ды не, абавязкова знаходзіцца дэмагог і з наскоку пачынае: пакажы пасведчанне, а з-за чаго ты інвалід і сыпле пятае-дзесятае. Калі б вы толькі ведалі, што ў такі момант робіцца на душы, ад сораму хоць скрозь зямлю правалыся. А ў чарзе насуплена маўчаць, а сёй-той яшчэ і хіхікае...»

У Генадзя Пятровіча, як і ў многіх іншых ветэранаў, ёсць гэтыя самыя пасведчанні. Але, як ён зазначае, «колькі разоў сам быў сведкам», калі ў даўжэзнай чарзе ледзь стаіць-пакутуе састарэлы чалавек са слабым здароўем, у якога няма ніякага ветэранскага дакумента. Дык хіба мы, здаровыя людзі, не можам паклапаціцца пра такіх, не праявіць да іх міласэрнасць і спагадлівасць? Не толькі можам, але і абавязаны зрабіць менавіта так. І тут дарэчы будзе прывесці словы вядомай польскай пісьменніцы Элізы Ажэшка: «Жывы павінен дапамагаць жывому».

Калі б яно паўсюдна было так, то рэдакцыйная пошта амаль штодзень не прыносіла б пісьмы, у якіх крык душы, боль, скаргі і крыўда на няўвагу, несправядлівасць, безвыходнае становішча. Вось толькі некаторыя вытрымкі з гэтых допісаў. «У маёй сітуацыі толькі два выйсці: камень на шыю ды з моста ў раку, альбо ісці красці, каб злавіла міліцыя, а ў турме ўжо дадуць кавалак хлеба». (В. Жаўрыд, інвалід з дзяцінства, в. Ячава, Слуцкі раён). «Каля магазіна, што знаходзіцца па вуліцы Ілімскай, сабраўся вялізны натоўп. Я пачакаў, пакуль усе зойдуць, а то старога задушаць і ніхто не зверне ўвагі. Хлеба мне не хапіла. Узяў бутэлечку малака, але нейкая маладзіца выхапіла гэта малако ў мяне з рук са словамі: «Вы ўжо сваё ад'елі і адпілі...» (інвалід вайны I групы Пендзік, г. Мінск). «Па віне Ленінскага райсабеса г. Мінска я, ветэран вайны і працы, старая, хворая жанчына, на працягу чатырох месяцаў была пазбаўлена пенсіі, пакінута без капейкі ў такі цяжкі час. Як гэта можна кваліфікаваць?» (Я. Савіцкая, г. Краснадар).

Чытаеш такія пісьмы (а іх нямала на рэдакцыйным стале) і міжволі думаеш: «Людзі, людзі, што ж з вамі сталася, ці ж можна так рабіць?» Тым, хто адстаяў Радзіму ад ворага, узняў яе з руін і папялішчаў, пабудаваў тое, што мы сёння маем і чым карыстаемся, няхай яно нас і не задавальняе, замест пастаяннай падтрымкі і дапамогі раўнадушна сыплем соль на раны. Спрадвечная народная мудрасць вучыць і папярэджвае: ніколі не крыўдзі людзей, бо і людзі могуць пакрыўдзіць цябе.

Іван БРАЛКА,
рэдактар аддзела пісьмаў «Звязды».

РОЗГАЛАС

СКОТЛАНД-ЯРД У СЛОНІМЕ

Пра Скотланд-Ярд чулі, напэўна, усе. Знакамітыя англійскія сышчыкі даўно заваявалі добрую славу. Таму візіт двух дэтэктываў з берагоў туманнага Альбіёна ў Слонім быў у цэнтры ўвагі мясцовага люду. Мэта іх прыезду ў старажытны горад — расследаванне адной справы, пачатак якой хаваецца ў далёкіх ваенных гадах. А ў час адпачынку англійскія следчыя цікавіліся помнікамі гісторыі і культуры.

ПАВЕДАМЛЯЕМ ПАДРАБЯЗНАСЦІ

ДЗЯЛІЛІ ГУМАНІТАРНУЮ ДАПАМОГУ... ПАД «СІВАДЗЁР»

Газета «Звязда» паведамляла ўжо, што ў Брагіне па падазрэнню ў крадзяжы гуманітарнай дапамогі затрыманы галоўны ўрач цэнтральнай бальніцы В. Пярэў і медсястра Л. Рудзянок. Апошнія слова, безумоўна, за судом.

На гэты раз 20-тонны груз прыбыў з Германіі. Медыкаменты, прадукты харчавання, адзенне адправіў брагінцам пастар адной з каталіцкіх цэркваў. Гуманітарная дапамога з-за мяжы — гэта, вядома, добра. А належны кантроль над ёй — яшчэ лепш. Аднак у брагінцаў яго зноў не было.

Частку грузу размясцілі ў мясцовай царкве, астатні — у будынку метэастанцыі. Яе начальнік, дэпутат абласнога Савета народных дэпутатаў Наталля Нікіценка вырашыла, што толькі яна ўсё можа раздзяліць правільна, па справядлівасці.

Мінуў дзень, другі — ніхто нікому не аддае гэтай дапамогі. Аднак вокны метэастанцыі свецяцца далёка за поўнач. І не адну ноч, і не дзве. Затое, як кажуць, цугам ад'язджаюць адсюль машыны, знікаюць у цемры таямнічыя наведвальнікі.

Тады паляцелі тэлефонныя званкі пракурору раёна У. Жулегу і начальніку РАУС П. Ільянку. Пакуль там прыслухоўваліся да званкоў, мнагадзетныя маці з Брагіна арганізавалі сваю «групу захопу». У 4 гадзіны 30 мінут жанчыны затрымалі загадчыцу вытворчасці раённага камбіната бытавога абслугоўвання Тамару Асіпенка. З напакаванай рэчамі імпартнай сумкай прыйшлося ёй весці размову з гэтай «групай захопу». Але Т. Асіпенка ўлучыла момант, пусцілася ваўцёкі і пакінула тое, што прызначыла ёй Н. Нікіценка.

Выклікалі міліцыю. Аказалася, што густ у народнай абранніцы неблагі: больш за паўсотні назваў розных замежных тавараў знайшлі ў яе невялікім пакойчыку. Праўда, адзярыць яго работнікам міліцыі гаспадыня не захацела. Вадзіла, вадзіла, як кажуць, за нос, пакуль тыя не вырашылі ўзламаць дзверы. І вось што высветлілася. Распакоўваючы замежныя пасылкі, Н. Нікіценка са сваімі сабутыльнікамі (зазначым: перад гэтым метэастанцыя гудзела ўсю ноч. Пілі «сівадзёр», запівалі імпартным півам, закусвалі такім жа шакаладам і іншымі далікатэсамі. Нават сведкі потым гэтага бессаромнага гульбішча паказвалі кавалак імпартнай каўбасы, які ляжаў у сабакі пад носам толькі злёгку надкусаны — ён, ужо здаволіўся) выбрала толькі каштоўныя, новыя рэчы. Напрыклад, шубу за некалькі тысяч рублёў яна пакінула сабе. Аб астатнім і гаварыць не варта: яго хапіла б нават на цэлы дзіцячы садок.

Па факту крадзяжу гуманітарнай дапамогі з метэастанцыі ўзбуджана крымінальная справа.

Але пасля гэтага разгарэўся яшчэ больш сыр-бор. Начальніку аддзела ўнутраных спраў П. Ільянку, напрыклад, за «ўзняты шум» сваякі Н. Нікіценка пагражаюць зняць падпалкоўніцкія пагоны, у суд падаць на мясцовага радыёжурналіста С. Скамароха, які расказаў па радыё пра гэты ганебны выпадак. Нясуцца тэлефонныя пагрозы і пракурору раёна У. Жулегу.

І яшчэ адна акалічнасць. Выбарчыкі акругі № 120 падалі хадайніцтва, каб іх абранніца больш не прыкрывалася мандатам дэпутата абласнога Савета.

Цікава, а што ўсё ж скажа Гомельскі абласны Савет?

Уладзімір КРЫЖАНОЎСКІ,
карэспандэнт брагінскай раённай газеты «Маяк Палесся».

ГАСЦІНІЦА НА ПРЫКОЛЕ...

ГРОДНА. Пасільны ўклад у вырашэнне праблемы недахвату гасцінічных месцаў уносіць чыгуначны вакзал абласнога цэнтра. Як? Зусім проста. Два купэйныя вагоны загнаны ў тупік і прыстасаваны пад свайго роду гасцініцу на колах. Трэба сказаць, што новая форма «сервісу» прыйшлася даспадобы заезджым гасцям: вагоны ніколі не пустуюць. Напэўна, галоўная прычына таму — невысокі кошт начлегу: усяго 25 рублёў.

АПЕРАЦЫЯ «МАТАЦЫКЛІСТ» У СВЕТЛАГОРСКУ

Аперацыі «Матацыклісты», «Чыстае паветра» для светлагорцаў не рэдкасць. ДАІ раёна праводзіць іх штогод. Не стаў выключэннем і чэрвень гэтага года. Толькі за 10 дзён затрымана 30 уладальнікаў транспартных сродкаў за кіраванне ў нецвярозым стане.

У мінулым годзе дарожна-патрульная служба набыла чатыры скарасныя «Явы». Цяпер можна гнацца за парушальнікамі і па вясковых дарогах, пералесках, сцяжынках. Два гады назад з дзесяці ўцякаючых затрымлівалі прыкладна аднаго-двух. Цяпер амаль усіх. Вось і на здымку інспектары ДПС сяржанты міліцыі Сяргей ТРАЦЦЯКОЎ і Іван МІТРАХОВІЧ затрымалі двух навучэнцаў, якія «ехалі на сваіх «Явах» без вадзіцельскіх пасведчанняў, а тэхагляд іх аўтасроднаў быў праведзены пяць гадоў назад.

Тэкст і фота А. ДРАЗДОВА.

ЭКСПАРТ СКАРАЧАЕЦЦА

МІНСК. З пачатку 1992 года з Мінска на экспарт пастаўлена прадукцыі на 1.464,9 мільёна рублёў ва ўнутраных цэнах. Гэта амаль 5 тысяч трактароў, 430 грузавых аўтамабіляў, 16 тысяч веласіпедаў, 88,1 тысячы халадзільнікаў, 22,3 тысячы тэлевізараў. У параўнанні з мінулым годам экспартныя пастаўкі грузавікоў скараціліся на 65,8 працэнта, трактароў — на 25,1, халадзільнікаў — на 31,8, тэлевізараў — на 15,2 працэнта.

Паводле даных Мінгарстатупраўлення.

Па «Розгаласу» дзяжурылі А. Коктыш, А. Сланеўскі, С. Сулкоўскі, І. Шчучэнка. Тэл. 32-44-02, 32-43-03.

ТАКОЕ «СУСЕДСТВА» ДА ДАБРА НЕ ДАВЯДЗЕ

Відаць, каб не пужалі наведвальнікаў пустыя паліцы агароднінных магазінаў, кіраўніцтва аграгандлёвай фірмы «Бярэзіна» ў Бабруйску затаварыла свае магазіны прадукцыяй гідролізнага завода. У паўлітровых бутэльках на этыкетках значыцца, што гэта — спірт этылавы рэктыфікаваны, тэхнічны. І папярэджваецца, што вадкасць вогненебяспечная і прымаць яе ўнутр таксама не варта.

З якога гэта часу работнікі прылаўка забыліся аб такім паняцці, як «таварнае суседства», і калі стала магчымым тэхнічныя гаспадарчыя вадкасці прадаваць разам з прадуктамі харчавання?

ПАЧАТАК МІНСКАЙ МІЖНАРОДНАЙ КАНФЕРЭНЦЫІ АДКЛАДЗЕНЫ

Міжнародная канферэнцыя па Нагорнаму Карабаху ў Мінску, адкрыццё якой намячалася на 23, а затым 25 чэрвеня, адкладзена. Аб гэтым паведаміў карэспандэнту БЕЛТА загадчык аддзела Міністэрства замежных спраў Беларусі Уладзімір Шчасны.

Ен вярнуўся з Рыма, дзе разам з прадстаўнікамі Азербайджана, Арменіі, Расіі, а таксама Італіі, ЗША, Германіі, Чэха-Славакіі, Швецыі, Францыі і Турцыі прымаў удзел у доўгай надзвычайнай сустрэчы па падрыхтоўцы мірнай канферэнцыі па Нагорнаму Карабаху.

Рымская сустрэча перапыніла сваю работу, — сказаў Уладзімір Шчасны, — так і не пераадолеўшы ўсіх перашкод на шляху склікання мінскай канферэнцыі. Асноўнай прычынай, якая выклікала адсутнасць дагаворанасцей, сталі сур'ёзныя супярэчнасці паміж армянскай і азербайджанскай дэлегацыямі. Сустрэчы ў Рыме прадоўжацца толькі пасля завяршэння нарады кіраўнікоў дзяржаў—удзельніц НБСЕ ў Хельсінкі, намечанай на 30 чэрвеня. І толькі пасля таго, як удзельнікі сустрэчы ў Італьянскай сталіцы прыйдуць да пагаднення па ўсіх пытаннях, будуць назначаны тэрміны правядзення мінскай канферэнцыі.

interfax ИНТЕРФАКС

ГРУЗІНСКАЕ ЗЯМЛЯЦТВА МАСКВЫ ПІКЕЦІРУЕ ДОМ САВЕТАЎ

Каля 60 актывістаў грузінскага земляцтва ў Маскве выставілі з раніцы ў аўторак пікеты ля Дома Саветаў РФ на Краснапрасненскай набярэжнай. Як паведамляе карэспандэнт «Інтэрфакса», пікетчыкі пратэстуюць супраць нядаўняй заявы па Паўднёвай Асеціі кіраўніка расійскага парламента Руслана Хасбулатава і выступлення па тэлебачанні 21 чэрвеня па гэтым жа пытанні віцэ-прэзідэнта Расіі Аляксандра Руцкога.

Сярод лозунгаў, якія трымаюць удзельнікі акцыі: «Хасбулатаў, «Матроская цішына» вам апладзіруе!», «Настальгія па Афганістане, таварыш Руцкой?», «Імперскія амбіцыі загубяць Расію, а Хасбулатаў — расійскую дэмакратыю!»

НА МАСКОЎСКАЙ МІЖБАНКАЎСКАЙ ВАЛЮТНАЙ БІРЖЫ КУРС ДОЛАРА ПАДЫМАЕЦЦА (1 ДОЛАР — 146 РУБ.)

На таргах Маскоўскай міжбанкаўскай валютнай біржы (ММВБ), якія адбыліся ў аўторак, 23 чэрвеня, курс продажу долара ЗША склаў 146,0 руб. Агульны аб'ём продажу — каля 44 млн.

На папярэдніх таргах 18 чэрвеня курс долара быў зафіксаваны на ўзроўні 129 руб., а аб'ём продажу — 44 млн. 950 тысяч долараў.

СХОД ТУВІНСКАГА НАРОДА ВЫКАЗАЎСЯ ЗА РЭФЕРЭНДУМ ПА ВЫХАДУ З РАСІІ

Каля 700 удзельнікаў сходу прадстаўнікоў тувінскага народа, які адбыўся ў сталіцы Тувы—Кызыле падтрымалі прапанову Народнага фронту «Свабодная Тува» правесці рэферэндум аб незалежнасці і выхадзе рэспублікі з саставу Расіі.

АВІЯКАТАСТРОФА У КРАСНАЯРСКІМ КРАІ

Як паведамілі ў прэс-цэнтры МУС Расіі, у мінулы панядзелак удзень пры заходзе на пасадку ў аэрапорце Алыкель горада Нарыльска (поўнач Краснаярскага краю), як мяркуецца, з-за няспраўнасці рухавіка пацярпеў катастрофу транспартны самалёт АН-12, які ляцеў з Андыжана (Узбекістан). Паводле папярэдніх даных, з 12 пасажыраў і члена экіпажа, якія знаходзіліся на борце, 9 чалавек загінулі, трое шпіталізаваны. Пачалося расследаванне прычын катастрофы.

ЗАБАСТОЎКА ШАХЦЁРАЎ ВАРКУТЫ НЕ АДБЫЛАСЯ

Агульнагарадская папераджальная забастоўка ў Варкуце, запланаваная на 22 чэрвеня, не адбылася. Яна была намечана ў сувязі з затрымкай выплаты шахцёрам зарплаты і запазычанасцю расійскага ўрада па наяўных грашах Рэспублікі Комі. У выпадку, калі сітуацыя не будзе выпраўлена ў самыя кароткія тэрміны, з 1 ліпеня мяркавалася аб'явіць бестэрміновую забастоўку варкуцінскіх гарнякоў.

У ТОМСКІМ МЕДІНСТЫТУЦЕ СА СТУДЭНТАЎ З КРАІН СНД БЯРУЦЬ ПЛАТУ

Рэктарат Томскага дзяржаўнага медыцынскага інстытута аб'явіў аб тым, што прыём студэнтаў з краін Садружнасці будзе ў гэтым годзе рабіцца толькі пры наяўнасці ў іх дакументаў, якія гарантуюць аплату ўсяго курса навучання. Яна вызначана ў 50 тыс. рублёў за семестр.

Ад аплаты вызвалены студэнты-рускія, а таксама асобы іншых нацыянальнасцей, якія не маюць дзяржаўнасці ў межах Садружнасці.

КОЗЫРАЎ: РАСІЯ НЕ ПЕРАШКАДЖАЕ ЎСТУПЛЕННЮ ГРУЗІІ У ААН, ШЭВАРДНАДЗЕ ЕДЗЕ У ДАГАМЫС

Міністр замежных спраў Расіі Андрэй Козыраў у тэлефонай размове днём у аўторак са сваім грузінскім калегам Аляксандрам Чыкваідзе абмерг прагучаўшае па тэлебачанні паведамленне аб тым, што Расія перашкаджае ўступленню Грузіі ў ААН. Пра гэта паведаміў на пасяджэнні Дзяржсавета ў Тбілісі 23 чэрвеня яго старшыня Эдуард Шэварднадзе. Па яго словах, А. Козыраў заявіў, што Расія падтрымлівае прапанову Вялікабрытаніі, якая прадстаўляе ў ААН інтарэсы Грузіі, аб яе ўступленні ў члены гэтай арганізацыі.

Э. Шэварднадзе, які раней у аўторак паставіў пад сумненне свой удзел у перагаворах з лідэрамі Расіі, Паўночнай і Паўднёвай Асеціі ў сувязі з памянёным тэлевізійным паведамленнем, пацвердзіў на Дзяржсавеце намер адправіцца на сустрэчу з Б. Ельцыным, А. Галазавым і Т. Кулумбегавым у Дагамыс.

ДА АБСТАНОЎКІ У ПРЫДНЯСТРОЎІ

Дзяжсакратар пры ўрадзе Прыднястроўскай Малдаўскай Рэспублікі Валерый Ліцкай ахарактарызаваў абстаноўку, якая склалася ў Бендэрах да вечара ў аўторак, як «адноснае зацішша». У інтэрв'ю «Інтэрфаксу» ён паведаміў, што ў горадзе працягваюцца асобныя перастрэлкі, агонь вядуць малдаўскія снайперы. У шэрагу раёнаў няма электрычнасці, адсутнічае сувязь.

Паводле даных прэс-цэнтра ўрада Прыднястроўя, з пятніцы ў выніку жорсткіх сутыкненняў у раёне Бендэр загінула звыш 500 чалавек, параненых і пацярпеўшых — арыенцёравана 3,5 тысячы чалавек.

Гэтыя звесткі катэгарычна абвяргаюцца прэс-цэнтрам Міністэрства абароны Малдовы, які лічыць іх «яўна завышанымі». Па словах аднаго з супрацоўнікаў прэс-цэнтра, можна гаварыць пра «дзесяткі ахвяр».

Прыднястроўскія крыніцы перадаюць, што грамадзянскае насельніцтва Бендэр працягвае пакідаць горад, а ў Кішынёве абвінавачваюць Цірасполь у правакаванні панікі.

КАМУНІСТЫ ТАТАРСТАНА МАЮЦЬ НАМЕР ДАБІВАЦЦА АДСТАЎКІ ЕЛЬЦЫНА І АДРАДЖЭННЯ КПСС

Арганізацыя камуністаў Рэспублікі Татарстан (АКРТ) мае намер дабівацца адстаўкі прэзідэнта Расіі Барыса Ельцына, вяртання ўласнасці КПСС і перарэгістрацыі яе членаў. Пра гэта было заяўлена на канферэнцыі камуністаў у Казані.

Сакратар рэспубліканскага камітэта АКРТ падпалкоўнік Аляксандр Салій абвінаваціў у развале Расіі «рэакцыйныя сілы Захаду і іх агентаў Гарбачова і Ельцына». Ен заклікаў камуністаў аб'яднацца, каб «зламаць хрыбет дэмакратам».

У РАСІІ 14 ТЫСЯЧ ЧАЛАВЕК АСУДЖАНЫ ЗА НАРКАМАНІЮ

Паводле паведамлення прэс-службы міжнароднай асацыяцыі па барацьбе з наркаманіяй і наркабізнесам, у Расіі адбываюць тэрмін пакарання 5 тысяч асуджаных за наркаманію і 9 тысяч чалавек, схільных да ўжывання наркотыкаў. У месцах зняволення яны праходзяць прымусовае лячэнне, але, адпаведна статыстычным даным, толькі 20 працэнтаў з іх, выйшаўшы на волю, не будуць ужываць наркотыкі зноў.

ПРЫВАТЫЗУЕМ ЖЫЛЛЁ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

ўпаміналася асаблівая роля «гастралёраў» — выхадцаў у першую чаргу з каўказскага рэгіёна.

Улічваючы ўзнікшую абстаноўку і дзейнічаючы ў адпаведнасці з зацверджаным урадам планам, МУС рэспублікі распрацавала шэраг канкрэтных арганізацыйна-практычных мер па ўзмацненню барацьбы са злачыннасцю. Яны пачынаюць ужо прыносіць першыя вынікі. Гэтыя вынікі, падкрэсліў міністр, былі б намнога больш важкімі, каб своечасова задавальняліся патрабаванні органаў МУС па павелічэнню колькаснага саставу міліцыі, па яе аснашчэнню транспартам і сродкамі сувязі. Тут галоўная перашкода — яўна недастатковае фінансавае забеспячэнне, а таксама адсутнасць належнай дапамогі з боку арміі, якая пры сваім скарачэнні магла б частку тэхнікі перадаць праваахоўным органам.

Па прапанове прэм'ер-міністра быў вызначаны месячны тэрмін для задавальнення гэтых надзённых патрабаванняў міліцыі. «На такой жыццёва важнай для нашых грамадзян сферы, як забеспячэнне законнасці і правапарадку, — заявіў В. Ф. Кебіч, — эканоміць нельга».

На пасяджэнні Прэзідыума былі разгледжаны праблемы сацыяльна-культурнага і эканамічнага развіцця вёскі і аграпрамысловага комплексу, некаторыя іншыя праблемы сацыяльна-эканамічнага жыцця.

Служба інфармацыі Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь —БЕЛТА.

АРГАНІЗАЦЫЯ ПРАДАЕ СА СКЛАДА

◆ **тэлефаксы «Самсунг СФ 1000» — адаптаваны і дазволены да выкарыстання ў СНД;**

◆ **тэлевідэакомплексы «Арыён-5190» — моноблок у саставе тэлевізара з поўным сервісам, дыстанцыйным кіраваннем і ўбудаваным поўным відэамагнітафонам — надзейная сучасная мадэль, нязручная для крадзяжу;**

◆ **печы мікрахвалевыя «Прывілег» — 750 Вт. 17 л, грыль;**

◆ **ксераксы «Канон-1520» — фармат А3, маштабіраванне, непатрабавальнасць, адсутнасць праблем з расходнымі матэрыяламі;**

◆ **радыётэлефоны і аўтаадказчыкі;**

◆ **персанальныя камп'ютэры АТ-286 стандартнай канфігурацыі.**

Арганізуем на прадпрыемствах продаж тавараў шырокага ўжытку.

ТЭЛ. У МІНСКУ: 47-43-50, 48-36-57.

МЕРЫ ВЫЗНАЧАНЫ, АЛЕ...

ГОМЕЛЬ. **(У. Перыкаў).** Сярод гарадскога насельніцтва ўсё настойлівей заяўляе аб сабе праблема занятасці. Сёння афіцыяльна зарэгістравана больш як 500 беспрацоўных. Лічба, здаецца, невялікая, але яна трывожыць работнікаў мясцовых Саветаў.

Каб зняць напружанасць у гэтым пытанні, іх службы прааналізавалі змены сацыяльна-дэмаграфічнай сітуацыі ў вобласці за апошні час, распрацавалі праграму занятасці насельніцтва на гэты год, склалі мерапрыемствы па стабілізацыі абстаноўкі ў абласным цэнтры ў сувязі з масавым вызваленнем працуючых з прадпрыемстваў, арганізацый і ўстаноў.

Аднак ніхто не можа даць стопрацэнтную гарантыю таго, што гэтыя і іншыя меры поўнасцю змогуць зняць праблему беспрацоўя.

Таму напружанасць, як бачым, застаецца. Трывога ў людзей не знікае.

СЛУЖБА 01

РЭЧЫ - ЗАБОЙЦЫ

Кожны год ахвярамі агню становяцца 400—450 чалавек. Гэта насельніцтва трох-чатырох сярэдніх беларускіх вёсак. Тым больш крыўдна, што такое здараецца не ў гады ваеннага ліхалецця, а ў мірны час.

Зразумела, многія з гэтых трагедый — вынік неахайнасці ў абыходжанні з агнём саміх жа ахвяр. Той не адрамантаваў своечасова печ, другі парушыў правілы эксплуатацыі электраприбора ці газавай пліты, трэці закурыў у ложку і заснуў...

Адна з галоўных прычын значнага павелічэння колькасці ахвяр на пажарах — укараненне ў наша жыццё прадметаў дамашняга ўжытку з сінтэтычных матэрыялаў. Успомнім, што было ў нашай хаце ці кватэры ў недалёкім мінулым і з чаго яно было выраблена? Любая рэч — ці гэта стол, ці табурэт, крэсла, шафа або канапа — абавязкова былі з натуральнай драўніны, а не з драўнінастружкавых ці валакністых пліт, насычаных фармальдэгіднымі смоламі. А тыя ж коўдры, бялізна...

Раней гэтыя рэчы, як правіла, выраблялися з лёну ці бавоўны. А таму калі і здараўся іншы раз пажар, то чалавек у большасці выпадкаў не толькі сам паспяваў выйсці з задымленага дома, але і вынесці сякі-такі набытак да прыбыцця пажарных. А сёння ж з-за наяўнасці ў кватэры значнай колькасці сінтэтычных матэрыялаў, пры гарэнні якіх у час пажару выдзяляюцца такія моцнадзеючыя атрутныя рэчывы, што вытрымаць у такім асяроддзі хвіліну-другую вельмі цяжка нават даросламу чалавеку, не кажучы ўжо пра дзіця.

Сёння, вядома, немагчыма ўявіць, як гэта можа лёгкая прамысловасць працаваць без сінтэтычнай сыравіны, ці прадпрыемствы па вытворчасці мэблі — без тых жа ДСП ці ДВП, лакаў, паралону і г. д. Але ж трэба распрацаваць тэхналогію вытворчасці цяжкагаручых ці зусім негаручых матэрыялаў. Дорага? А чым тады ацаніць жыццё соцень людзей, якія кожны год гінуць у агні? Дарэчы, гінуць часцей не ад агню, а менавіта ад дыму, газаў.

Возьмем для прыкладу той жа Захад. У развітых краінах нават пасцельныя рэчы —негаручыя. Ёсць і ў час нядрэнныя распрацоўкі. Хоць бы тая ж тэхналогія вытворчасці цяжкагаручай драўніны. Ды карысці ад такіх распрацовак мала, бо лягчэй, напэўна, зрабіць якое-небудзь вынаходства, чым укараніць яго ў вытворчасць. Словам, для пачатку трэба адно: каб ні адзін выраб, ні адзін матэрыял не выпускаўся прамысловасцю без наяўнасці «пажарнага» сертыфікату. Гэтым мы выратуем жыццё многіх людзей, зберажом матэрыяльных каштоўнасцей ад знішчэння агнём на мільёны рублёў.

Васіль БАГАМ'Я,
галоўны спецыяліст ГУПА МУС Рэспублікі Беларусь.

Я іду шукаць, можаце не хаваць

Дзе злодзей, што прапік у чужую кватэру, шукае схаваныя каштоўнасці? Вось своеасаблівы рэйцінг прыярытэтаў, складзены паводле даных апытання амерыканскіх «дамушнікаў»:

1) скрынка з бруднай бялізнай;
2) шафа для адзення, матрацы;
3) начны столік, шафа ў ванным пакоі;
4) шафа для абутку;
5) халадзільнік;
6) пральная машына;
7) мікрахвалевая печ.

Кожнаму па здольнасцях...

СЛОНІМ. Пашанцавала невядомаму злодзею, які завітаў у магазін, што ў вёсцы Дзераўная. Мала таго, што ён забраў выручку амаль у 50 тысяч рублёў, дык яшчэ з сабой прыхапіў на 10 тысяч розных каштоўнасцей.

АМЕРЫКАНЦЫ Ў БЕЛАРУСІ

Амерыканцы не падобныя на людзей, якія бяздумна раскідваюцца сродкамі. І калі яны праяўляюць у апошні час пэўную ўвагу да рэспублікі — у сэнсе бізнесу, хоць тут, відаць, нельга прыменшыць заслугі і нашай дыпламатыі, значыць, у гэтым нешта ёсць. Значыць, не ўсё страціла наша эканоміка. Як, вядома ж, не ўсё страчана і для яе...

Прыкладна паўгода назад у Мінску адбылася беларуска-амерыканская канферэнцыя па развіццю сумеснага бізнесу. Зусім нядаўна зроблены буйны практычны крок — на базе магілёўскага аб'яднання «Хімвалакно» пачало дзейнічаць сумеснае прадпрыемства «БЕЛПАК». Былі таксама проста сустрэчы...

І вось працяг знаёмстваў: учора ў Мінску пачала працаваць другая беларуска-амерыканская навукова-практычная канферэнцыя «Бізнес-92», на якой намечана абмеркаваць пытанні прыцягнення ў рэспубліку замежных інвестыцый, развіцця знешнеэканамічнага супрацоўніцтва і абмену эканамічнай інфармацыяй. Напэўна, можна чакаць і новых практычных крокаў? Менавіта адной з галоўных мэт канферэнцыі запісана: расшырэнне супрацоўніцтва нашых і амерыканскіх прадпрыемстваў, арганізацый, фірм.

Наш інтарэс — вядомы, а які ён у амерыканцаў? Выступаючы на канферэнцыі, намеснік Старшыні Савета Міністраў рэспублікі М. Косцікаў адзначыў такі фактар, як геаграфічнае становішча рэспублікі, праз якую ляжыць шлях бізнесу на ўсход. Гэта немалаважна, разам з тым, няйначай, амерыканцы разглядаюць рэспубліку і як найбольш надзейную з рэспублік былога Саюза ў сэнсе гарантый інвестыцый, як найбольш стабільную. Капітал не кідаецца туды, дзе гучаць выстралы.

У рабоце канферэнцыі, якая разлічана на тры дні, удзельнічаюць прадстаўнікі больш дзесяці замежных кампаній з самымі рознымі накірункамі дзейнасці і каля 50 — з нашага боку (у тым ліку ад іншых краін СНД). Застаецца пажадаць, каб і сапраўдны сумесны бізнес, і плённае супрацоўніцтва не прымусілі сябе чакаць, каб на іх шляху былі зняты апошнія бар'еры рызыкі, дзеля чаго ў асноўным, відаць, і вядзецца прыстрэлка на падобных канферэнцыях. Зрэшты, часовы павераны ЗША ў рэспубліцы Дэвід Суорц адносна супрацоўніцтва, як ён сам падкрэсліў, поўны аптымізму.

***

Учора ў Мінску адбылося яшчэ адно важнае беларуска-амерыканскае мерапрыемства: падпісана двухбаковае пагадненне па інвестыцыях, у якім прадугледжаны палітычныя гарантыі ўраду ЗША наконт бяспекі. Такім чынам, знаёмства не проста працягваецца, але і замацоўваецца.

Кар. «Звязды».

З ЗАЛЫ СУДА

Помста «каралевы»

Юная мазыранка, санітарка анкалагічнага дыспансера Наталля Хамянок абвясціла сябе «каралевай» мікрараёна «Маладзёжны». Гэты тытул, лічыла яна, даваў ёй неабмежаваныя правы: бесперашкодна камандаваць дзяўчатамі, вадзіць за сабой гурт хлопцаў, зневажаць сваіх сяброўак, эдзекавацца з іх, хуліганіць. І ўсё, як кажуць, праходзіла дарма. А той цёплай летняй ноччу мінулага года пасля кулачнага бою Наталля арганізавала згвалтаванне непаўналетняй і трапіла на лаву падсудных...

Асаблівай стараннасцю ў школе Наталля не вызначалася. Так, перабівалася з тройкі на чацвёрку, але ў цэнтры ўвагі сваіх аднагодкаў і старэйшых па ўзросту хлопцаў любіла быць. Лёгка паддавалася шкоднаму ўплыву і адначасова, як кажуць, набівала сабе цану. Часта гаварыла няпраўду, дапамагала хаваць крадзенае. І заўсёды адчувала за сабой падтрымку хлопцаў з сумніцельнай рэпутацыяй, адкрыта заяўляючы пры гэтым, што карону «каралевы» не ўступіць нікому.

Так было і ў той раз, калі да яе дайшлі чуткі, што непаўналетняя Каця Б. у адной кампаніі непаважліва ахарактарызавала яе. Ні ў якім выпадку нельга дапусціць, каб нават цень лёг на аўтарытэт «каралевы», вырашыла Хамянок і задумала расквітацца з «крыўдзіцелькай». Зручны момант хутка наступіў, калі ўвечары Наталля, яе старэйшая сяброўка рабочая хлебазавода Ганна Пейсаховіч, Аляксандр Цалко і малады, нідзе не працуючы, але раней ужо двойчы судзімы Віктар Емяльянаў сустрэлі Кацю. Наталля адвяла яе крыху ўбок ад плошчы, дзе было многа людзей (тут канчатковыя прыпынкі некалькіх аўтобусных маршрутаў), і злосна спытала:

— Плёткі распускаеш? Можа, маё месца заняць хочаш?

— Ды што ты, Наташа? — узмалілася тая і тут жа атрымала два ўдары кулаком.

Емяльянаў цыркнуў праз зубы:

— Не месца тут, Наташка, для высвятлення адносін. Людзей вынь колькі, — і, узяўшы Кацю за руку, павёў у двор дома.

Там Хамянок сарвала з галавы дзяўчыны заколку, ударыла яе некалькі разоў па твары, потым — каленам у жывот.

На дапамогу Хамянок прыйшоў Емяльянаў. Ён схапіў Кацю, адарваў яе ад зямлі і, як бервяно, шпурнуў на лаўку. Потым, для нагнятання страху, махнуў паўпудовым кулаком перад носам дзяўчыны.

— Прасі літасці, кайся, — наступала Хамянок.

— Я ні ў чым не вінаватая, — стаяла на сваім Каця.

Наталля адвяла Віктара ад лаўкі, аб нечым пашапталася з ім.

— Калі так, пашкадуеш. Горкімі слязамі ўмыешся, — пагрозліва зазначыла яна.

Праз колькі часу яна спыніла легкавушку, дзе былі два яе знаёмыя, і загадала везці ўсю кампанію ў вёску Дразды. Кацю запіхнулі ў машыну, і яна з жахам думала, што яе чакае ў далейшым. Просьбы адпусціць выклікалі ў Хамянок крывую ўсмешку, астатнія ж быццам і не чулі.

Вось і могільнік, цьмяна асветлены месяцам. Емяльянаў сказаў Наталлі, каб тая папулярна растлумачыла дзяўчыне мэту прыезду сюды. Хамянок падсечкай спрабавала збіць з ног Кацю, але гэта не ўдалося. І тады ў яе ўчапілася Ганна Пейсаховіч. Каця апынулася на зямлі, і Наталля нагой стала на яе косы, а Ганна садрала з яе ног абутак, шкарпэткі і павесіла іх на крыж. Хлопцы моўчкі назіралі за тым, як з дзяўчыны зрываюць адзенне. Праз нейкую хвіліну Каця была ў чым маці нарадзіла.

— Ты павінна танцаваць на магіле ламбаду і раз-пораз станавіцца на карачкі, — жорстка загадала Хамянок. — Адмовішся — будзем біць балюча і доўга. Даць музыку!

— Музыкі ў нас няма, — адказалі вадзіцель аўтапрадпрыемства Алег Пятровіч і рабочы мэблевай фабрыкі Юрый Бальшакоў (гэта іх спыніла Наталля ў горадзе).

— Нічога, я паіграю пад язык, — сказала Хамянок.

Беднай Каці нічога не заставалася рабіць, як выконваць загад. І калі Хамянок уволю наздзекавалася з дзяўчыны, пазмяінаму прашыпела:

— А зараз табой займуцца хлопцы. Віця, пачынай!

Емяльянаў пацягнуў перапалоханую Кацю ў глыбіню могільніка, дзе згвалтаваў яе. Вярнуўся праз колькі хвілін назад і перадаў дзяўчыну ў рукі Наталлі.

— Што вы стаіце, як ёлупні? — накінулася яна на астатніх трох хлопцаў, якія тапталіся на месцы. — Бярыце яе голенькую, цешцеся!

Але на тых ці то падзейнічалі слёзы Каці, ці то яны задумаліся аб выніках, толькі дзяўчыну не кранулі.

І вось суд. Адбыўся ён са спазненнем, бо Наталля Хамянок чакала дзіця. Нарадзіўшы дачку, яна тут жа ў радзільным доме адмовілася ад мацярынскіх правоў на яе. На судовым працэсе ў Мазыры паводзіла сябе, нібы бяскрыўднае ягня. Нікому нават не верылася, што яна можа быць іншай — бязмежна жорсткай і цынічнай, здольнай учыніць злачынства, якое вызначаецца асаблівай дзёрзкасцю. Але ж факты—рэч упартая.

Таму ёй давядзецца два з палавінай гады правесці ў выхаваўча-працоўнай калоніі агульнага рэжыму. Віктар Емяльянаў пяць з палавінай гадоў правядзе ў калоніі строгага рэжыму. Ганна Пейсаховіч асуджана на паўтара года з адтэрміноўкай прыгавору на год. А што ж датычыць астатніх, з чыёй маўклівай згоды было ўчынена гэтае злачынства, то на гэты раз яны выйшлі сухімі з вады. І хай задумаюцца аб сваім раўнадушшы.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

г. Мазыр.

ВЕСТКІ АДУСЮЛЬ

МАФІЁЗНАЯ КОНТРАТАКА

У кватэру іграка валгаградскай футбольнай каманды «Ротар» Вераценнікава ўварваліся трое невядомых. Яны пырснулі гаспадару ў твар з газавага балончыка, а потым білі металічнымі прутамі, імкнучыся ўдарыць яго па нагах. Пацярпеўшы лічыць, што гэта акцыя — помста мафіёзных груп Екацярынбурга за яго пераход з мясцовага «Уралмаша» ў «Ротар».

ТАКУЮ РЫБУ ЕШ САМ

Нягледзячы на смехатворную па нашым часе цану — 22 рублі 50 капеек за кілаграм, — жыхары сталіцы Татарстана адмаўляюцца купляць волжскую рыбу. Яе тут называюць «бактэрыялагічнай зброяй», маючы на ўвазе стан ракі, з якой гэтая рыба вылаўлена. Такім чынам, слава аб чысціні вялікай рускай ракі аказалася дутай.

ШТОСЬЦІ З ДАРОЖНАГА РУХУ АЛЬПІНІСТАЎ У НЕПАЛЕ

Пра ўзыходжанне альпіністаў расійскага клуба «ВАЗ» на Эверэст было напісана і сказана ўжо дастаткова. Толькі аб адной маленькай дэталі ніхто не асмеліўся нагадаць. Справа ў тым, што італьянскія альпіністы звярталіся ў міністэрства турызму Непала за дазволам штурмаваць вяршыню па паўднёва-заходнім схіле, але потым перадумалі і ўзніміліся ўжо па паўднёва-ўсходнім. Можа, у Расіі на такую дробязь увогуле не звярнулі б увагі, а вось Непал дзейнічаў прынцыпова — адзінаццаці ўдзельнікам узыходжання забаронена наведванне гэтага горнага каралеўства на працягу бліжэйшых пяці гадоў.

ЦЭНЫ СКАЧУЦЬ, ЯК ШАЙТАН

Кошт «спажывецкай карзінкі», толькі што зацверджаны ў рэспубліцы, як паведамляе Дзяржкамстат Казахстана, узняўся ў 3,8 раза.

НА АЛАХА СПАДЗЯВАЙСЯ...

Дзве тысячы стыпендый выдзелена ўрадам Турцыі для навучання студэнтаў з рэспублік Сярэдняй Азіі ў Анкары.

ГАСПАДАРЧАЕ ВЫКАРЫСТАННЕ

У ГАСПАДАРЦЫ з кветак святаяннікy можна атрымаць фарбавальнік жоўтага, ружовага ці чырвонага колеру. З адвару травы з дабаўленнем жалезаамоніевых квасцоў атрымліваюць зялёны фарбавальнік.

СТРАВЫ СА СВЯТАЯННІКАМ

З ТРАВЫ гатуюць прыправы да рыбных страў, робяць напіткі, чаі.

Напітак са святаяннікy. 50—70 г здробненай травы святаяннікy з лісцем і кветкамі настойваць у 1 л кіпеню 1 гадзіну ў цёплым месцы ці ў тэрмасе. Працадзіць, дабавіць цукар ці мёд.

Чай са святаяннікy. Здробненую свежую ці сухую траву заварыць як чай. Піць па шклянцы 2—3 разы на дзень. Рэцэптура: 10 г святаяннікy на 250 мл вады.

Парашок. Высушаную траву святаяннікy здрабніць у кавамолцы. Выкарыстоўваць пры прыгатаванні і кансерваванні рыбных страў.

ЛЕКАВЫЯ ЎЛАСЦІВАСЦІ

У НАРОДНАЙ МЕДЫЦЫНЕ выкарыстоўваюць траву святаяннікy. Ужываць прэпараты з яго ўнутр можна толькі па назначэнню ўрача, строга захоўваючы правілы прыёму і тэрміны лячэння. У некаторых выпадках адзначаецца павышаная адчувальнасць арганізма да сонечных прамянёў, з'яўляюцца дэрматозы, узбуджаецца нервовая сістэма. У народнай медыцыне лічаць, што святаяннік дапамагае ад дзевяноста дзевяці хваробаў.

Трава аказвае вяжучае, кроваспыняльнае, болесуцяшальнае, антысептычнае, раназагойвальнае, мачагоннае, жоўцягоннае дзеянне, паляпшае апетыт, узмацняе выдзяленне страваўвальных сокаў.

Масла падсушвае, дэзінфіцыруе раны, язвы, паляпшае рэгенерацыю тканак.

Настой святаяннікy. 10 г травы настойваць у 200 мл кіпеню 30 хвілін, працадзіць. Піць па 1 сталовай лыжцы 3—4 разы ў дзень пры хваробах страўніка, кішэчніка, печані, жоўцевага пузыра, нырак, мачавога пузыра, нырковакаменнай хваробе, гемарої.

Настой святаяннікy. 20 г травы настойваць у 250 мл кіпеню 10 хвілін, пасля працадзіць. Піць ахалоджаным па 50 мл 3—4 разы на дзень за 30 хвілін да яды пры паносах, халецыстытах, кашлі, жаночых хваробах, матачных крывацёках, начным нетрыманні мачы. Праціраць скуру твару пры тлустай себарэі, вуграх.

Адвар са святаяннікy. 20 г здробненай травы варыць у 250 мл кіпеню 10 хвілін, працадзіць. Піць па 40 мл 4 разы на дзень за 30 хвілін да яды пры калітах.

Алей са святаяннікy. 10 г кветак настойваць у персікавым ці мінданьным алеі 2—3 тыдні, працадзіць, прыкладваць да ранаў, язваў, пролежняў, апёкаў.

Мазь са святаяннікy. Здробненую траву змяшаць з алеем, дадаць шкіпінар. Уціраць у балючыя месцы (радыкуліты, артрыты).

Здробненае свежае лісце прыкладваць да ранаў, язваў, сінякоў.

Трава святаяннікy ўваходзіць у састаў мачагонных, вяжучых, процірэўматычных збораў.

Проціпаказанні: павышаны артэрыяльны ціск.

НАРЫХТОЎКА

НАРЫХТОЎВАЮЦЬ ТРАВУ ў час цвіцення, да з'яўлення няспелых плодаў. Зразаюць вяршкі з кветкамі вострым нажом, сякатарам, сярпом так, каб не вырваць усю расліну, не пашкодзіць каранёў. Іх неабходна пакідаць для захавання зараснікаў. Акрамя таго, трэба пакідаць на месцы збору частку раслін з кветкамі для размнажэння насеннем.

Сушаць на гарышчы, пад паветкаю, у духоўках ці сушылках пры тэмпературы не вышэй 40°С, пакуль сцёблы не пачнуць ламацца.

Высушаная сыравіна складаецца з тонкіх сцяблін з лісцем, бутонамі залацістажоўтых кветак, невялікай колькасці недаспелых плодаў. Пах слабабальзамічны, смак гаркавата-салонаваты, даўкі, злёгку сцягвае.

Захоўваць у снапках, мяшках, у добра праветраным памяшканні.

Тэрмін захоўвання да 2 гадоў.

Ніна АЛЯКСЕЙЧЫК,
Валер САНЬКО.

Святаяннік прадзіраўлены

НАРОДНЫЯ НАЗВЫ: святаяннік дзіркаваты, святаянскае зелле, кроўка, дзюравец, зелле святога Івана, расанкі, крываўнік, бярозка, заеча кроў, сямёнава кроў, чырвоная травіца, зверазабой.

На Беларусі расце паўсюдна па берагах рэк, у змешаных лясах, на сухадольных лугах, сярод хмызнякоў, па ўзлесках.

Шматгадовая травяністая расліна вышынёй 50—100 см. Сцёблаў некалькі, яны прамыя, зеленаватыя ці чырванавата-бурыя.

Лісты сядзячыя, шаравата-зялёныя, з кропкамі, якія прасвечваюцца чорнымі залозкамі, у якіх утрымліваюцца смалістыя рэчывы.

Цвіце з чэрвеня па жнівень. Кветкі буйныя, шматлікія, жоўта-залацістыя, сабраныя ў шчытападобныя суквецці. Пры расціранні афарбоўваюць рукі ў жоўта-пурпуровы колер.

Плады — трохгранныя шматнасенныя каробачкі. Насенне дробнае, бурае, паспявае ў жніўні-верасні.

У расліне ўтрымліваюцца антацыяны, азулен, алкалоіды, фарбавальнае рэчыва гіперыцын, вітамін С, нікацінавая кіслата, каратын, цукар, сапаніны, смалістыя рэчывы, спірт, фітанцыды, эфірны алей, флавоноіды і інш.

Налева пойдзеш— жабраком станеш. Направа—галаву страціш

Ніхто не верыў, што гэта калі-небудзь дойдзе да нас. Канешне, у параўнанні з сацыяльнымі, усе іншыя беды не былі настолькі надзвычайнымі. Тое, што здавалася небяспечным, навучыліся распазнаваць, нават прагназіраваць нейкія драматычныя падзеі. Але больш страшная тая бяда, аблічча якой яшчэ незнаёмае.

Ацаніць маштабы магчымай катастрофы ў сувязі з пагрозай сусветнай эпідэміі СНІДу даволі цяжка. І ўсе вынікі для Беларусі нават спецыялісты не заўсёды могуць прадбачыць. На сённяшні дзень у рэспубліцы ўжо 79 ВІЧ-інфіцыраваных. Як гэтае становішча расцэньваюць у Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, раскажа прадстаўнік Еўрапейскага рэгіянальнага бюро САЗ Аляксандр Іванавіч ГРАМЫКА.

— Беларусь з'яўляецца часткай Усходняй Еўропы. У заходняй частцы Еўропы на гэты час зарэгістравана 70 тысяч выпадкаў СНІДу і больш за 2 мільёны ВІЧ-інфіцыраваных. На ўсходняй частцы — у краінах былога сацлагера і краінах СНД — на ўвесь гэты вялікі рэгіён налічваецца дзесьці каля 2 тысяч выпадкаў СНІДу. Якраз і ў Беларусі два чалавекі памерлі ад СНІДу. Гэта выклікае ў заходнім свеце вялікае здзіўленне: ці яны не могуць вытлумачыць свой СНІД, некампетэнтныя ў пытаннях дыягностыкі, ці гэта аб'ектыўна такое становішча? Але мы маем цяпер поўнае права сцвярджаць, што на самай справе ўсё менавіта так, і Усходняя Еўропа застаецца рэгіёнам з нізкай эндэмічнасцю. Гэта абумоўлена шэрагам абставін. Тут інфекцыя пачала распаўсюджвацца дзесьці ў 1986—87 гадах, на пяць—шэсць гадоў пазней, чым на Захадзе, гэтыя краіны былі адносна «закрытымі» ад астатняга свету. Таму САЗ зараз заклапочана, каб пакінуць гэты ўзровень, спыніць распаўсюджванне інфекцыі. Мы плануем правесці ў Мінску нараду, каб скаардынаваць нацыянальныя праграмы краін СНД, даведацца, якія праблемы ў іх.

— Пасля «парада суверэнітэтаў» на тэрыторыі былога Саюза кожная рэспубліка павінна вырашаць свае цяжкасці сама, у тым ліку і па праблеме СНІДу. Ці возьме рэгіянальнае бюро САЗ каардынацыю дзеянняў супраць СНІДу ў дзяржавах СНД?

— Мы плануем абмеркаваць гэтыя пытанні на сустрэчы, якая адбудзецца ў Мінску. Можа краіны лічаць неабходным стварыць свой каардынацыйны цэнтр, а можа яны пажадаюць, каб САЗ узяла на сябе гэтую справу? І Еўрапейскае рэгіянальнае бюро падрыхтавана да таго, каб стаць пасрэднікам паміж краінамі. Аднак тут ёсць адна невялікая замінка: руская мова з'яўляецца адной з рабочых моў САЗ, але практычна ўсе зносіны вядуцца на англійскай мове. Магчыма, гэта стане перашкодай для таго, каб САЗ узяла на сябе ролю каардынатара.

— Усе антыснідаўскія праграмы ў свеце, як правіла, добра фінансуюцца, і на ўрадавым узроўні. У нас усе пытанні вырашае Міністэрства аховы здароўя, у якога і без таго цяжка са сродкамі. Ці рэальная дапамога цывілізаванага свету, які ўжо зразумеў небяспеку распаўсюджвання віруса, Рэспубліцы Беларусь хоць бы па СНІДу?

— У мінулыя гады СССР была краінай-донарам. Да студзеня 1992 г. яна ўносіла штогодахвяраванні ў глабальныя праграмы барацьбы са СНІДам, для таго каб САЗ дапамагала развіваючымся краінам у ажыццяўленні сваіх нацыянальных праграм. Таму ніякай фінансавай дапамогі з боку САЗ не можа быць. У даным выпадку Беларусь не краіна-донар, канешне, але неабходна спачатку ацаніць, наколькі такая дапамога вам неабходна, магчыма, вы і самі зможаце знайсці сродкі. Мы маглі б дапамагчы набыць розныя прэпараты, дыягнастычныя сістэмы — праз САЗ гэта будзе значна танней. Калі вам сапраўды неабходна дапамога ў рэалізацыі ўласнай нацыянальнай праграмы, мы пажадалі б, каб быў зроблены зварот у бок САЗ. Мы лічым, што вам патрэбна ў першую чаргу нейкая прафесіянальная дапамога ці інфармацыйная: літаратура, відэаматэрыялы і г. д.

— Сёння ў Беларусі цэнтр па прафілактыцы СНІДу, створаны ў сістэме Міністэрства аховы здароўя, імкнецца зацікавіць гэтай работай іншыя ведамствы. Але ва ўмовах рынку кожны хвалюецца за сябе, і ўсе звароты павісаюць у паветры. Улічваючы работу антыснідаўскіх структур іншых краін, што вы маглі б падказаць Беларусі ў арганізацыі такой справы?

— Каб ажыццявіць сваю нацыянальную праграму, патрэбны міжведамасны камітэт, які стаў бы каардынатарам. Калі такі камітэт ствараецца, ён звычайна складаецца з прадстаўнікоў розных міністэрстваў — адукацыі, культуры, унутраных спраў і іншых. Усе яны так або інакш зацікаўлены ў рэалізацыі праграмы. Узначальвае яе звычайна кіраўнік краіны. У такім выглядзе камітэт сапраўды моцны орган, здольны вырашаць складаныя пытанні, з якімі не справілася б адно Міністэрства аховы здароўя. Але, я падкрэсліваю, — мы толькі рэкамендуем, а кожная краіна выбірае сама, як ёй будаваць сваю работу.

— Свет сутыкнуўся з эпідэміяй намнога раней, і ўжо набыты пэўны вопыт прафілактычнай работы. Ці збіраецца САЗ падзяліцца ім з намі?

— Зараз мы развіваем сувязі непасрэдна з кожнай краінай СНД паасобку, каб увесь вопыт, які вядомы САЗ, быў выкарыстаны, напрыклад, у Беларусі. Дэлегацыя Беларусі ўжо пабывала ў лютым гэтага года на кангрэсе сусветнай арганізацыі аховы здароўя ў Даніі, была магчымасць пазнаёміцца з праграмай, якая распрацавана ў рэгіянальным бюро. Думаю, што вашы спецыялісты знайшлі б для сябе шмат карыснага ў сустрэчах, якія мы плануем рэгулярна праводзіць з удзелам экспертаў САЗ. Здаецца, што матэрыял і вопыт вашай краіны таксама будзе цікавы, таму што тут толькі ўсё пачынаецца і асноўныя цяжкасці яшчэ наперадзе. Беларускаму цэнтру па прафілактыцы СНІДу давядзецца добра папрацаваць. Ужо зараз, як я ведаю, тут дасканала даследуецца кожны выпадак ВІЧ-інфекцыі, шукаюцца магчымыя кантакты, каб папярэдзіць распаўсюджванне хваробы. Трэба адзначыць добры ўзровень канфідэнцыяльнасці, захавання медыцынскай тайны.

Калі гэтая размова надала вам пэўны аптымізм, маўляў, сусветнымі намаганнямі неяк прарвёмся, а там і лекі знойдуцца, — то ёсць тут і над чым задумацца. Бо ўвесь час Беларусі даводзілася спраўляцца са сваімі бедамі самой, нягледзячы на абяцанні. А калі да нашага Чарнобыля далучыць яшчэ і пагрозу СНІДу, то непавага да лёсу кожнага чалавека можа перарасці ў сапраўдную трагедыю для ўсіх беларусаў, гэтак жа як і жаданне самому вяршыць свой лёс, нягледзячы на перасцярогі.

Ларыса ЦІМОШЫК.

ШАХМАТЫ

Пад рэдакцыяй майстра спорту У. СЫЧОВА.

ТВОРЫ КОНКУРСУ СКЛАДАННЯ У. Іванову (Наваполацк)

Белыя: Крe1, Фh3, Лc6, Лc8, Са8, пп: а6, f3, f5, g2 (9).

Чорныя: Кра7, Сd8, пп:с5, с7, g3 (5).

Мат за 2 хады.

В. Іванову (Барысаў)

Белыя: Крb6, Фd4, Лa2, Лe6, Са3, Сh5, Кg2, пп:с2, d2, f4 (10).

Чорныя: Крd1, Фh4, Лf3, Кg1, п. а5 (5).

Мат за 2 хады.

ПАЯДЫНАК БРАТОЎ НА ПАЧАТКУ СТАГОДДЗЯ

У 1157 годзе, пасля смерці Юрыя Далгарукага, яго сын Андрэй стаў князем растоўскім, суздальскім і ўладзімірскім. Ён першым прысвоіў сабе тытул вялікага князя «усяе Русі». А праз пяць гадоў, у 1162 г., у вёсцы Багалюбава князь згуляў партыю з васьмігадовым братам Усеваладам.

Калі у партыі узнікла пазіцыя (прыводзім не на дыяграме), князь Андрэй (чорныя фігуры) вырашыў, што з лішняй пешкай не трэба выйграваць у хлопчыка і прапанаваў таму нічыю. Аднак юны Усевалад адмовіўся, і здолеў фарсіравана загнаць чорнага караля ў матавую пастку. Паміж братамі ўсчалася сварка, якую не змагла спыніць і маці.

Праз 12 гадоў, у ноч на 29 чэрвеня, Андрэй быў забіты баярамі. Княжаскі прастол заняў Усевалад, якога аўтар «Слова аб палку Ігаравым» назваў «вялікі княжа» і падкрэсліваў, што яго рацэ можа Волгу расчэрпаць вёсламі і шлёмамі вычарпаць Дон.

Але звернемся да пазіцыі на дыяграме. Ход за белымі. Як маленькі Усевалад выйграў у брата? Чакаем адказаў?

ТЭЛЕБАЧАННЕ

25 чэрвеня

Беларускае тэлебачанне

14.05. «Пушча». Маст. фільм.
16.15. «Ветразь, вецер і мы». Кінанарыс.
16.30. Навіны.
16.35. «Кожны дзень свята». Дзіцячая музычная школа № 9 г. Мінска.
17.30. «Алі-Баба і сорак разбойнікаў». Мультфільм.
18.00. Хто праполе лён? Перадача з Магілёва.
18.20. Дак. фільм «Даліна нарзана?».
18.40. Сустрэчы на міжнародным кангрэсе прамыслоўцаў і прадпрымальнікаў. Перадача 1-я.
19.00. Абласныя навіны (Гродна).
19.10. Зачытайце маё пісьмо...
19.15. Прафсаюзы: праблемы, каментарыі.
19.35. Родныя слова. Тэлечасопіс.
20.20. Тыдзень беларускага ўрада.
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.25. Латарэя ўдачы.
21.30. Студыя «Сэнс» у Ваўкавыскім раёне.
23.00. НІКа.
23.15. «Як зорка на небе ўпачы...». Рамансы Л Абеліёвіча на вершы Ф. Цютчава.

І канал. Астанкіна

14.00. Навіны.
14.25. Гэта было... было...
14.40. «Задача з трыма невядомымі». Маст. фільм. 2-я серыя.
15.45. «Кампазіцыя на тэму... Рыжык». Мультфільм.
15.55. Фільм — дзецям. «Гепард вяртаецца».
17.00. Навіны.
17.20. ...Да 16 і старэйшым.
18.00. Дзённік І Міжнароднага юнацкага конкурсу імя П. І. Чайкоўскага.
18.20. «Багатыя таксама плачуць». Маст. фільм.
19.05. Тэлескоп.
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.35. «SOS». Аб сітуацыі ў дзіцячых дамах.
21.05. Маст. фільм «400 хітрыкаў Віржыні». 3-я серыя.
22.00. Музыка ў эфіры. У перапынку (23.00) — Навіны.
0.20. Мультфільмы для дарослых «Эй, на тым беразе!», «Дробязь», «Чалавек і слова».
0.45. Дак. фільм «Нараджэнне тэатра Нарты».
1.15. «Задача з трыма невядомымі». Маст. фільм. 2-я серыя.

Канал «Расія»

15.00. Там-там-навіны.
15.15. Тэрмінал.
15.45. У свеце жывёл.
16.45. Т. Ін. Ка.
17.00. Бізнес і палітыка.
18.00. Парламенцкі веснік.
18.15. Студыя «Нотабене».
18.45. «Суддзі». Аб Канстытуцыйным судзе Расіі.
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. За рамкамі «Вестак».
19.45. Пятае кола.
20.30. «Хрона». У свеце аўта- і мотаспорту.
21.00. Пятае кола: Працяг.
22.00. Весткі.
22.20. Экран крымінальных паведамленняў.
22.30. На сесіі ВС Расіі.
23.00. Тэніс. Уімблдонскі турнір.

26 чэрвеня

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. «Дзяўчына без адрасу». Маст. фільм.
14.10. «Дадатковы прыбывае на другі пуць». Маст. фільм. 1-я і 2-я серыі.
16.30. Навіны.
16.35. «Капрызна», «Дом для Кузькі», «Верашок». Мультфільмы.
17.35. Іграе «Вясёлка». Выступае фальклорны аркестр народных інструментаў СШ № 190 г. Мінска.
18.00. «Жывая дрэва душа», «Матыльні высакагор'я». Дак. фільмы.
18.40. Сустрэчы на міжнародным кангрэсе прамыслоўцаў і прадпрымальнікаў. Перадача 2-я.
19.00. Абласныя навіны (Магілёў).
19.10. Метраном. Музычна-публіцыстычная праграма. Прамая лінія.
20.30. «Чаплі мяняюць прапіску». Дак. фільм.
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.25. «Дзяўчына без адрасу». Маст. фільм.
22.50. На шляху да Варселоны. Алена Хлопцава. Акадэмічнае веславанне.
23.05. НІКа.
23.20. II Рэспубліканскі тэлеконкурс маладых выканаўцаў папулярнай беларускай песні. Другі тур.

І канал. Астанкіна

8.00. Навіны.
8.20. «Багатыя таксама плачуць». Маст. фільм.
9.05. Лімпапо.
9.35. Мультфільмы «Прыгоды Дамавяняці», «Вяртанне Дамавяняці».
10.05. «Адраджэнне музыкі».
10.35. «На скрыжаваннях зямных і касмічных трас».
11.00. Навіны (з сурдаперакладам).
11.20. Клуб падарожнікаў (з сурдаперакладам).
13.15. Брыдж.
13.40. Бізнес-клас.
14.00. Навіны.
14.20. Слявае «Гама».
14.35. «Святло маяка». Маст. фільм.
15.40. Мультфільмы «Крот у заапарку», «Крот і зялёная зорка», «Крот і транзістар».
16.05. Юніёр-банк.
17.00. Навіны.
17.25. Чалавек і закон.
17.55. Фільм для дзяцей «Эміль з Лекебергі» (Швецыя). 11-я серыя.
18.20. ТБ «Нява». «Хто з намі?»
18.40. Вячэрні альбом.
19.00. Дак. фільм «Чэмпіён нумар адзін».
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.35. «Рэпартаж ні пра што».
20.50. Від прадстаўляе: «Поле цудаў», «Адпачывай», «Хіт-канвеер». У перапынку (23.00) — Навіны.
0.35. «Ранішняя зорка» ў начным эфіры.
1.35. «Святло маяка». Маст. фільм.

Канал «Расія»

7.00. Весткі.
7.20. Час дзелавых людзей.
7.50. Вольны час. «ТБ-атэлье».
11.45. Момант ісціны. На пытанні А. Каравулава адказвае Мітрапаліт Валакаламскі і Юр'еўскі Піцірым.
12.40. Сялянскае пытанне.
13.00. Весткі.
15.00. Там-там-навіны.
15.15. Першы тайм.
16.00. Прастора плюс.
16.30. Сігнал.
16.45. Т. Ін. Ка.
17.00. Паралельныя сусветы.
17.45. «КамАЗ: дзень за днём». Перадача 3-я.
18.00. Так і жывём.
18.45. «Суддзі». Аб Канстытуцыйным судзе Расіі.
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. Залатая шпора.
20.00. Рэтра «Аркадзь Райкін і іншыя...»
20.25. На сесіі ВС Расійскай Федэрацыі.
21.00. Футбол. Чэмпіянат Еўропы. Фінал. У перапынку — Рэклама: Весткі.

interfax
ИНТЕРФАКС

Лідэр палітычнай і эканамічнай інфармацыі — агенцтва «Інтэрфакс» сумесна з Маскоўскай таварнай біржай і расійскім Саюзам прамыславікоў і прадпрымальнікаў

ПРАПАНУЮЦЬ УСІМ ДЗЕЛАВЫМ ЛЮДЗЯМ СВАЁ ВЫДАННЕ

«БІРЖАВЫЯ НАВІНЫ»

* 5 разоў на тыдзень—самая аператыўная біржавая інфармацыя па тэлетайпу, факсу, электроннай пошце!

* У нас — сотні падпісчыкаў у дзесятках дзяржаў!

«Біржавыя навіны»—гэта:

* Валютныя, фондавыя, таварныя рынкі ў СНД і краінах Прыбалтыкі.

* Біржавы аналіз, каментарый, прагноз.

☐ КАЛІ ВЫ ХОЧАЦЕ ШТОСЬЦІ КУПІЦЬ ЦІ ПРАДАЦЬ
☐ КАЛІ ВАМ НЕАБХОДНА ВЕДАЦЬ СЁННЯШНІЯ ЦЭНЫ НА РОЗНЫХ БІРЖАХ СНД І ЗА ЯЕ МЕЖАМІ —

ВАМ НЕ АБЫСЦІСЯ БЕЗ «БІРЖАВЫХ НАВІН» «ІНТЭРФАКСА»!

Наш адрас: 103006, г. Масква, вул. Цвярская, 32/1.
Тэл. (8-095)-250-92-32; 250-96-37.
Факс (8-095)-250-97-27; 250-89-94.

Маладзечанскі політэхнічны тэхнікум

АБ'ЯЎЛЯЕ ПРЫЁМ НАВУЧЭНЦАЎ на 1992/93 навучальны год

НА ДЗЁННАЕ НАВУЧАННЕ:

У ГРУПЫ НА БАЗЕ ДЗЕВЯЦІГАДОВАЙ (базавай) ШКОЛЫ па спецыяльнасцях:

● тэхнічнае абслугоўванне станкоў з праграмным кіраваннем і робататэхнічных комплексаў з паглыбленым вывучэннем асноў праграмавання;
● мантаж і эксплуатацыя электраабсталявання прадпрыемстваў і грамадзянскіх будынкаў;
● эксплуатацыя і рамонт абсталявання харчовых вытворчасцей;
● тэхналогія захавання і перапрацоўкі збожжа;
● тэхналогія кансервавання;
● тэхналогія вінаробства;
● радыёапаратабудаванне;
● хлебапякарная, макаронная і кандытарская вытворчасць.

У ГРУПЫ НА БАЗЕ СЯРЭДНЯЙ (адзінаццаці-дванаццацігадовай) ШКОЛЫ па спецыяльнасцях:

● тэхнічнае абслугоўванне станкоў з праграмным кіраваннем і робататэхнічных комплексаў;
● тэхналогія захавання і перапрацоўкі збожжа;
● хлебапякарная, макаронная і кандытарская вытворчасць.

НА ЗАВОЧНАЕ НАВУЧАННЕ

У ГРУПЫ НА БАЗЕ СЯРЭДНЯЙ ШКОЛЫ па спецыяльнасцях:

● тэхнічнае абслугоўванне станкоў з праграмным кіраваннем і робататэхнічных комплексаў;
● радыёапаратабудаванне;
● мантаж і эксплуатацыя электраабсталявання прадпрыемстваў і грамадзянскіх будынкаў;
● эксплуатацыя і рамонт абсталявання харчовых вытворчасцей;
● хлебапякарная, макаронная і кандытарская вытворчасць.

УСТУПНЫЯ ЭКЗАМЕНЫ

Асобы, скончыўшыя базавую школу, паступаючыя на ўсе спецыяльнасці, а таксама сярэднюю школу, паступаючыя на спецыяльнасці: тэхнічнае абслугоўванне станкоў з праграмным кіраваннем і робататэхнічных комплексаў; радыёапаратабудаванне; мантаж і эксплуатацыя электраабсталявання прадпрыемстваў і грамадзянскіх будынкаў; эксплуатацыя і рамонт абсталявання харчовых вытворчасцей, здаюць экзамены па наступных прадметах: беларуская мова і літаратура (дыктант); матэматыка (вусна).

Асобы, скончыўшыя сярэднюю школу і паступаючыя на спецыяльнасці: хлебапякарная, макаронная і кандытарская вытворчасць; тэхналогія захоўвання і перапрацоўкі збожжа, здаюць экзамены па наступных прадметах:

беларуская мова і літаратура (дыктант); хімія (вусна).

Без уступных экзаменаў за 5 дзён да іх пачатку прымаюцца асобы, скончыўшыя з адзнакай — базавую агульнаадукацыйную школу, з залатым ці сярэбраным медалём — сярэднюю агульнаадукацыйную школу, з дыпломам з адзнакай — прафесіянальна-тэхнічнае вучылішча на базе няпоўнай сярэдняй школы.

Прыём заяў на дзённае навучанне па 31 ліпеня, уступныя экзамены і залічэнне — з 1 па 25 жніўня.

Прыём заяў на завочнае навучанне па 10 жніўня, уступныя экзамены і залічэнне — па 30 жніўня.

Да заявы прыкладаюцца наступныя дакументы:

дакумент аб базавай ці сярэдняй адукацыі (арыгінал);

медыцынская даведка па форме № 0866/у;

чатыры фотакарткі для дакументаў (3×4 см);

выпіска з працоўнай кніжкі ці кніжкі калгасніка, заверэная адміністрацыяй (прадстаўляецца маючымі стаж практычнай работы і паступаючымі на завочнае навучанне).

Пашпарт (пасведчанне аб нараджэнні), дакумент аб адносінах да воінскага абавязку прадстаўляецца асабіста ў прыёмную камісію, дзе робіцца адпаведны запіс у асабовай справе.

Пачатак заняткаў 1 верасня 1992 года.
Усе навучэнцы забяспечваюцца інтэрнатам.
Заявы паступаючым на дзённае і завочнае навучанне накіроўваць на адрас:
Рэспубліка Беларусь, 222310, г. Маладзечна, Мінская вобласць, плошча Леніна, 2, палітэхнікум, прыёмная камісія.

СОВЕТСКАЯ БЕЛОРУССИЯ — СЁННЯ Ў НУМАРЫ

Паведамленне аб афіцыяльным візіце ў Польшчу Станіслава Шушкевіча.

Актуальнае інтэрвю з намеснікам дырэктара Рэспубліканскага цэнтра занятасці насельніцтва Мікалаем Коханавым **«Колькі аблічча ў беспрацоўя?»**

Нататкі эканамічнага аглядальніка «СБ», кандыдата эканамічных навук Валерыя Дашкевіча **«Эканамічным праграмам патрэбна палітычная стабільнасць».**

Пад рубрыкай «Грымасы рынку» публікацыя Мікалая Давідзюка **«Карыстаючыся «фортканай».**

Падборка **«Чытач — чытачу».**

Тэматычная старонка **«Справы жыццёвыя».**

Калегіум Вярхоўнага суда Рэспублікі Беларусь выказвае глыбокае спачуванне старшыні Вярхоўнага суда Беларусі Уладзіміру Сяргеевічу Караваю з выпадку напаткаўшага яго гора — смерці блізкага і роднага чалавека — маці Веры Іванаўны.

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь, калектыў рэдакцыі газеты «Звязда».

Першы намеснік галоўнага рэдактара М. МІХАЕВІЧ.
Рэдакцыйная калегія: У. АНДРЫЕВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), І. БАРАНОЎСКІ, У. ГОЙТАН, В. ЖДАНКО, Л. ЛАХМАНЕНКА, М. МІХАЕВІЧ (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. МЯСНІКОЎ, Л. РЫЖАНКОВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. ЦІХАНОВІЧ, С. ШАУЦОЎ.

НАШ АДРАС: 220041, гор. Мінск, праспект Ф. Скарыны, 77, рэдакцыя газеты «Звязда». ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная — 32-51-05, аддзела пісьмаў — 32-04-52, 32-41-92, навін — 32-60-13, даведкі па рэкламе і аб'явах — 32-35-91.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі.
Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з чытачамі.

Друкарня выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Тыраж 81.098. Індэкс 63.850.
Зак. № 126.
Выходзіць 250 разоў на год.
Нумар падпісаны ў 21.00.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12